Камуністычная партыя (бальшавікоў) Беларусі

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і МГК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

ЧЭРВЕНЬ 19 1933 г. № 133 (4677)

Год выданьня XVI

Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!

СЕНЬНЯ У НУМАРЫ:

Пастанова сакратарыяту ЦК КП(б)Б аб пастаноўцы аддзелаў лістоў у цэнтральных і раённых газэтах БССР (1 стар.).

Пастанова ЦК КП(б)Б і СНК БССР аб парушэньні зямлякарыстаньня ў калгасах Б-Кашалёўскага раёну (1 стар.).

АРТЫКУЛЫ: Перадавыя — Неадкладна рэалізаваць пастанову партыі аб палітаддзелах і калгаснай ячэйцы. За дзейнасьць лістоў працоўных.

МАНЬКОЎ—Справы камарынскія (3 стар.). БУТОМАЎ і ГАЛКІН—Грамадзкае харчаваньне—на службу полеву, уборцы і малацьбе (2 стар.).

ЛІСТЫ РАБСЕЛЬКОРАЎ (3 стар.).

ЗА МЯЖОЙ:

Правал канфэрэнцыі краін экспарцёраў пшаніцы (4 стар.).

Супярэчнасьці ў лягеры германскага фашызму (4 стар.).

Далейшае закрыцьцё капальняў у Польшчы (4 стар.).

РАЗГОРНЕМ СПАБОРНІЦТВА на ПЯРШЫНСТВА ва УБОРЦЫ ЎРАДЖАЮ І ПАСТАУЦЫ с.-г. ПРАДУКТАУ ДЗЯРЖАВЕ

Неадкладна рэалізаваць пастанову партыі аб палітаддзелах і калгаснай ячэйцы

— Я заклікан партыяй дапамагчы надцым калгасам стаць бальшавіцкімі. Я ганаруся тым, што заклікан на гэты баявы фронт. Прыпажу максымум бальшавіцкай энэргіі, каб апраўдаць давер'е партыі!

У гэтых словах, сказаных начальнікам палітаддзелу Рагачоўскай МТС тав. ВАЙМАНАМ, увасабляецца баявая энэргія, непахісная ўпэўненасьць і высокае пачуцьцё адказнасьці за даручаную справу многіх тысяч лепшых сыноў ленінскай партыі, спэцыяльна адабраных і пасланых на адказнейшы участак сацыялістычнага будаўніцтва.

Пасылка ў МТС і буйнейшыя саўгасы 10 тыс. адабраных камуністаў, якія ўпадаюць высокім тэарытычным узроўнем і багацейшым вопытам практычнай работы, — мерапрыемства найвялікшай палітычнай важнасьці. З часу арганізацыі палітаддзелаў прашоў параўнальна невялікі пэрыяд. Тым ня менш на практыцы праведзенай ужо веснавой сяўбы з усёй відавочнасьцю даказана выключна вялікая роля палітаддзелаў у справе кіраўніцтва сельскай гаспадаркай у новай абстаноўцы.

«Палітаддзелы сапраўды становяцца важнейшымі вагарамі партыі ў справе арганізацыйнага ўмацаваньня калгасаў, ачысткі іх ад клясава-варожых элемэнтаў, узмацненьня арганізуючай ролі камуністаў і камсамольцаў у калгасах і выпраўленьня недахопаў работы вясковых партыйных арганізацый. Палітаддзелы ператвараюцца ў сапраўдныя цэнтры згуртаваньня лепшых перадавых элемэнтаў калгаснай вёскі» (з пастановы ЦК УсеКП(б) ад 15-VI).

Стаўраньне палітаддзелаў і разгортваньне іх работы ў БССР адносіцца да пэрыяду завяршэньня падрыхтоўкі да веснавой сяўбы. На першых кроках сваёй дзейнасьці палітаддзелы сустрэліся з цэлым радам недахопаў у рабоце мясцовых парт'ячэек, з фактамі значнай засьмечанасьці клясава-варожымі элемэнтамі частак калгасаў і МТС. Палітаддзельцы з галавой увайшлі ва ўсе дэталі калгаснага жыцьця, аддаючы ўсю бальшавіцкую энэргію даручанай им справе. Няма такога палітаддзелу, каб у яго балянсе работы за гэты кароткі час на было паказальнікаў зруху ў бок паляпшэньня работы МТС, наладжваньня ў калгасах парадку і ўзмацненьня працоўнай дысцыпліны. І чым большы кантакт, чым большая ўзгодненасьць у рабоце паміж палітаддзеламі і райкомамі, тым больш посьпехаў, тым больш практычных вынікаў гэтай работы.

Мы маем нямала фактаў, што, дзякуючы энэргічнай рабоце палітаддзелаў, калгасы раёнаў дзейнасьці МТС ішлі наперадзе па правядзеньні веснавой сяўбы, забясьпечваючы першынства сваім раёнам у правядзеньні гэтай кампаніі (Танежыцкая, Спуцкая, Барысаўская і інш.).

На жаль, ня ўсе мясцовыя кіруючыя парторганы, ня ўсе партыйныя работнікі ўсьвядомілі гістарычнае значэньне пастановы партыі аб стварэньні палітаддзелаў, ролю, якую яны закліканы адыграць на даным, новым этапе развіцьця сацыялістычнага будаўніцтва ў вёсцы. Замест садзейнасьці ў рабоце палітаддзелаў і ўсямернага падтрыманьня іх ініцыятывы, з боку некаторых кіруючых работнікаў і райкомаў партыі праяўляюцца недапушчальныя пагардлівыя адносіны, выпадкі простага падрыву работы палітаддзелаў.

Вось некаторыя факты абураючых антыпартыйных паводзін асобных партыйцаў і райкомаў у адносінах да палітаддзелаў. Начальнік палітаддзелу ДЗЯРЖЫНСКАЙ МТС склікае нараду калгаснага актыву. Старшыня Старынкаўскага сельсавету ЮШКЕВІЧ узьняўся «на дыбы». Пачаў пратэставаць і ўжываць самыя агідныя мэтады, каб перашкодзіць скліканьню актыву. А калі наперакор яго жаданьням нарада сабралася, Юшкевіч выступіў з прамовай супроць палітаддзелаў і заявіў: «Палітаддзел — гаспадар толькі ў МТС, а не ў калгасах».

Бязгпузьдзіца, палітычная шкоднасьць такога выступленьня відавочная. Юшкевіч, выказваючы пратэсты супроць работы палітаддзелу ў калгасах, гаварыў кулацкай мовай. Адказ, прысутны на гэтай нарадзе ўпаўнаважаны РК КУСТАЎ прапусьціў міма сваіх вушэй гэтыя недапушчальныя выпады, ні слова не сказаў супроць паводзін разьюшанага Старынкаўскага «гаспадара». Больш таго, калі гэта пытаньне абмяркоўвалася на ячэйцы і Юшкевіч з бычыным упартасьцю настойваў на сваім, Кустаў выступіў з парадай.

— Глупства, — кажа ён, — няма аб чым спрачацца, памірыцеся (?!) і справа будзе ўладжана». Дзяржынскі райком рашуча рэагаваў на антыпартыйныя выпады Юшкевіча супроць палітаддзелу і прымірэнчыя адносіны да гэтага факту Кустава, прыцягнуўшы іх да суровай партыйнай адказнасьці.

Калі Дзяржынскі райком правільна ацаніў вылазку супроць палітаддзелу і даў належную палітычную ацэнку гэтаму факту, дык у ПОЛАЦКУ падобныя выпады ўзначальваюцца самімі работнікамі РК. Там сустрэлі палітаддзельцаў, як непажаданых «гасьцей», як «канкурэнтаў». З першых дзён работы палітаддзелу Полацкай МТС і па сёнешні дзень устаўляліся і ўстаўляюцца «палкі ў колёсы». Ігнараваньне палітаддзелу ўвашло ў сыстэму. Нават у такіх пытаньнях, як сродкі перасоўваньня, друкаваньне матар'ялаў палітаддзелу і перасылка пошты, Полацкі райком адмовіў. Рэдактар раённай газэты РАБІНОВІЧ, сьлепа плятучыся ў хвасьце раённага начальства, нават адмовіўся зьмясьціць допіс начальніка палітаддзелу тав. БЭРЗІНА, у якім выкрывалася засьмечанасьць калгасаў кулацкімі элемэнтамі і бязьдзейнасьць асобных упаўнаважаных райкому.

Сакратар Полацкага РК ЯЎСЕЕНКА ў сувязі з арганізацыяй у раёне двух палітаддзелаў МТС і двух палітаддзелаў саўгасаў, відавочна, занепакоіўся, што яму ня хопіць работы. Ён з выглядам нездавальненьня скардзіцца часта на «труднасьці» работы пры наяўнасьці чатырох палітаддзелаў (?!).

Ліст начальніка палітаддзелу Полацкай МТС тав. Бэрзіна, зьмешчаны ва ўчарашнім нумары «Зьвязды», сыгналізуе аб надзвычайна шкодных адносінах гэтага райкому да палітаддзелу і патрабуе неадкладнага рэагаваньня.

Тав. ГІКАЛО ў сваім выступленьні на нарадзе сакратароў райкомаў ЛКСМБ і пампалітаддзелаў МТС па камсамольскай рабоце ЗАВАСТРЫЎ УВАГУ НА НЕАБХОДНАСЬЦІ РАШУЧАГА ЗЬНІШЧЭНЬНЯ НЕЗДАРОВЫХ УЗАЕМААДНОСІН, МАЮЧЫХ МЕСЦА СЯРОД АСОБНЫХ РАЙКОМАЎ І ПАЛІТАДДЗЕЛАЎ І ЎСЯМЕРНАЙ САДЗЕЙНАСЬЦІ І ДАПАМОГІ Ў РАБОЦЕ ПАЛІТАДДЗЕЛАЎ. Няправільна разумеючы задачы палітаддзелаў, ігнаруючы іх, некаторыя мясцовыя кіруючыя партработнікі імкнуцца зьмякчыць сваю віну спасыланьнямі на пастанову ЦК КП(б)Б і СНК БССР ад 11 мая.

По гэтым пытаньні тав. ГІКАЛО на нарадзе заявіў:

«У парадку бальшавіцкай самакрытыкі трэба сказаць, што сама пастанова ЦК і СНК БССР у частцы, якая датычыць ацэнкі работы палітаддзелаў МТС (там гаворыцца: такое становішча (дрэнны ход сяўбы) зьяўляецца простым рэзультатам ганебнай работы кіраўніцтва МТС — дырэктароў і начальнікаў палітаддзелаў) — няправільна ўжо таму, што дапа падставу абвінавачваць начальнікаў палітаддзелаў у дрэнным рабоце і няправільна таму, што палітаддзелы ў гэтых МТС толькі прыступілі да работы, і ганебная работа МТС — рэзультат дрэннай работы ў першую чаргу дырэктара МТС і тых РК, якія да стварэньня палітаддзелаў МТС не кіравалі работай МТС, не дапамагалі Ім...»

Гэта памылка, па-бальшавіцку выкрытая тав. Гікало, цалкам адносіцца і да ўсяго цэнтральнага друку, у тым ліку да «Зьвязды» і да раённага друку, які ў асобных выпадках беспадстаўна абвінавачваў палітаддзелы ў спабасьці іх работы. Гэта асабліва трэба ўлічыць, каб не дапускаць падобных памылак у будучай рабоце.

Апублікаваная ўчора ў «Зьвязьдзе» пастанова ЦК УсеКП(б) «АБ РАБОЦЕ ПАЛІТАДДЗЕЛАЎ МТС, АБ КАЛГАСНАЙ ЯЧЭЙЦЫ І АБ УЗАЕМААДНОСІНАХ ПАЛІТАДДЗЕЛАЎ І РАЙКОМАЎ» з вычарпальнай паўнатой і аснасьцю акрэсьлівае задачы палітаддзелаў, разьмяжоўвае функцыі ў рабоце палітаддзелаў і райкомаў і патрабуе неадкладнай ліквідацыі няправільных, непартыйных адносін да палітаддзелаў, якія праяўляюцца з боку некаторых райкомаў.

Стварэньне побач з тэрытарыяльнымі вясковымі ячэйкамі калгасных вытворчых парт'ячэек, арганізацыя пры палітаддзелах шматтыражак, увядзеньне інстытуту жаргаў і іншыя мерапрыемствы, вызначаныя ў пастанове, пашыраюць магчымасьці работы і ўплыў палітаддзелаў у калгасах. Неабходна толькі па-баявому ўзяцца за рэалізацыю гэтай важнейшай дырэктывы партыі.

Перш за ўсё патрэбна глыбокая прапрацоўка пастановы ЦК УсеКП(б) ва ўсіх партыйных арганізацыях, каб кожны партыец дасканала ўсьвядоміў сутнасьць новай абстаноўкі ў вёсцы, арганізацыйныя мерапрыемствы ў пабудове партыйнай арганізацыі па вытворчым прынцыпе, ролю палітаддзелаў і неабходнасьць усямернай садзейнасьці ў іх рабоце. У гэтых мэтах паводле ПАСТАНОВЫ САКРАТАРЫЯТУ ЦК КП(б)Б 20 чэрвеня партыйны дзень прысьвячаецца прапрацоўцы пастановы ЦК УсеКП(б) аб палітаддзелах.

Прапрацоўка гэтай пастановы ў партыйных вясковых арганізацыях павінна суправаджацца канкрэтнай яе рэалізацыяй, перабудовай структуры вясковых парт'ячэек, умацаваньнем вытворчых брыгад у калгасах партыйнымі сіламі, больш шырокім разгортваньнем партыйна-масавай і культурна-асьветнай работы ў калгасах.

Няма сумненьня, што пры стварэньні сапраўднай бальшавіцкай абстаноўкі, дружнага кантакту ў рабоце палітаддзелаў і райкомаў, пры актыўнай дапамозе ўсёй партыйнай арганізацыі ў правядзімых палітаддзеламі мерапрыемствах, палітаддзелы з посьпехам справяцца з тымі вялізарнейшымі задачамі работы ў вёсцы, [illegible] на іх партыяй

КАЛГАСЫ СЛУЧЧЫНЫ СКОНЧЫЛІ ПРАПОЛКУ ПШАНІЦЫ

СЛУЦАК, 17. (БЕЛТА).

Да 14 чэрвеня калгасы Случчыны ПОЎНАСЬЦЮ ЗАВЯРШЫЛІ ПРАПОЛКУ ПШАНІЦЫ. Разгортваецца баранаваньне бульбы. Да 14 чэрвеня пра-баранавана 4.113,5 га (заданьне — 6.858 га). Многія калгасы праведзяць паўторнае баранаваньне бульбы.

Завяршаючы прапалачныя работы, калгасы прыступаюць да сенакоўбоўкі. Уводна арганізаваў праполку і касьбу калгас «КОЛАС», Бокшыцкага сельсавету. Гэты калгас адным з першых скончыў праполку яравых і баранаваньне бульбы. На прапалачных работах у вытворчых брыгадах былі арганізаваны зьвяленьні. Кожнае зьвяно адказвала за тэрміны і якасьць апрацоўкі на адным пэўным вучастку палёў брыгад.

Калгас разгарнуў сенакоўбоўку. За кожнай вытворчай брыгадай замацаваны вучасткі сенажаці. Да 13 чэрвеня калгас ужо ўбраў 34 га.

ЦК КП(б)Б — ГІКАЛО
СНК БССР — ГАЛАДЗЕДУ

СМАЛЕНСК, 18. (Па тэлеграфу).

Вітаем партыгарганізацыю, саветы, калгаснікаў і ўсіх працоўных БССР з пасьпяховым сканчэньнем веснавой сяўбы.

У сацыялістычным спаборніцтве паміж БССР і Заходняй вобласьцю першынства ў сяўбе засталося за вамі.

Просім прадоўжыць дагавор аб спаборніцтве з Заходняй вобласьцю на правядзеньне ўборачных работ і на датэрміновае выкананьне плянаў загатовак дзяржаве.

Мабілізуючы масы калгаснікаў і працоўных аднаасобнікаў на першачарговае выкананьне сваіх абавязацельстваў перад дзяржавай і на ажыцьцяўленьне лёзунгу правадыра нашай партыі тав. Сталіна „зрабіць усіх калгаснікаў заможнымі",—БССР і Заходняя вобласьць пад кіраўніцтвам ленінскага ЦК на чале з тав. СТАЛІНЫМ забясьпечаць поўнае асваеньне ўраджаю пасеву першага году другой пяцігодкі.

За бальшавіцкае правядзеньне ўборкі і загатовак у БССР і Заходняй вобласьці.

Сакратар Абкому УсеКП(б) **РУМЯНЦАЎ.**

Старшыня Абласнога Выканкому **РАКІТАЎ.**

Аб парушэньні зямлякарыстаньня ў калгасах Буда-Кашалёўскага раёну

Пастанова ЦК КП(б)Б і СНК БССР

Адзначыць, што ў радзе калгасаў Буда-Кашалёўскага раёну («Перамога», «Чырвоны араты», імя Сталіна і інш.) устаноўлены факты самавольнага захвату зямлі калгасаў калгаснікамі і аднаасобнікамі для індывідуальнага карыстаньня, які пачаўся восеньню мінулага году ў часе сяўбы азімых і ня спыняўся да апошняга часу.

Захват зямлі праходзіў пад уплывам адкрытай кулацкай агітацыі, якая шырока праводзілася пад лёзунгам «забясьпечыць сябе сваімі пасевамі». Гэтым кулацкім вылазкам ня быў дан рашучы адпор з боку РК, парт'ячэек, савецкіх арганізацый і праўленьняў калгасаў, а месцамі (калгас «Перамога», «Чырвоны араты») асобныя кандыдаты партыі, члены сельсаветаў і члены праўленьняў калгасаў самі прымалі ўдзел у захвале зямлі для сваіх пасеваў.

Ніжэйшага рэагаваньня на асеньні захват зямлі з боку раённых кіруючых арганізацый і сельсаветаў ня было. Вясной гэтага году РК КП(б)Б рэагаваў па захват зямлі фармальна, не даючы рашучага адпору кулацкім вылазкам і ня ўдарыў па камуністах, якія зрасьліся з кулакамі, і наогул недаацаніў усёй палітычнай важнасьці гэтага пытаньня.

ЦК КП(б)Б адзначае, што гэтыя факты маглі мець месца выключна таму, што з боку РК КП(б)Б і парт'ячэек на месцах ня было сапраўднай бальшавіцкай барацьбы за арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў, не дан рашучы адпор кулацкім імкненьням і рабоце, якая праводзілася да апошняга часу па падрыве калгаснага будаўніцтва і што асобныя кандыдаты партыі замест барацьбы з кулаком, шляхам арганізацыі і згуртаваньня шырокіх калгасных мас вакол партыйнай арганізацыі, самі сталі простымі дапаможнікамі кулака.

ЦК КП(б)Б пастанаўляе:

1. Зьняць з работы сакратара РК т. Смарчонка і старшыню РВК тав. Стройкіс за невыстарчальную барацьбу з кулацкімі і антыкалгаснымі праяўленьнямі ў калгасным будаўніцтве Буда-Кашалёўскага раёну.

2. Кандыдатаў партыі т. т. Янкава і Лосева, якія страцілі клясавую пільнасьць і сталі простымі дапаможнікамі кулака ў яго рабоце, накіраванай на разваньваньне калгасаў, з партыі выключыць.

3. Былому старшыні Патапаўскага сельсавету т. Нічыпарэнку, які не рэагаваў на масавы захват зямлі ў калгасах сельсавету, асабліва па калгасе імя Сталіна, і ўпаўнаважанаму РК па пасеўкампаніі ў Патапаўскім сельсавеце тав. Апуфрыеву абвясьціць вымову.

Тав. Нічыпарэнку з работы сакратара патапаўскай сельпартячэйкі зьняць.

4. Даручыць пракурору рэспублікі тэрмінова скончыць сьледзтва і прыцягнуць да судовай адказнасьці арганізатараў і натхняльнікаў захвату зямлі калгасу.

5. Прапанаваць Б.-Кашалёўскаму РК КП(б)Б узмацніць кіраўніцтва калгасу імя Сталіна, які ўвесь час, пачынаючы з мінулага году, знаходзіцца ў глыбокім прарыве па выкананьні гаспадарча-палітычных кампаній, правёўшы адпаведную работу па яго арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні.

6. Даручыць РК КП(б)Б на брыгадных сходах усіх калгасаў раёну абгаварыць пытаньне аб указаных фактах захвату зямлі ў калгасах, выкрываючы ўсе факты і мэтады кулацкай работы, мабілізуючы калгасныя масы на рашучую барацьбу з кулаком і бальшавіцкае выкананьне напаравай, прапалачнай і ўборачнай кампаній.

7. Прапанаваць усім цэнтральным газэтам на падставе гэтай пастановы разгарнуць шырокую растлумачальную работу.

ДА УСІХ КАМСАМОЛЬЦАЎ, ШТАБАЎ І ГРУП „ЛЕГКАЙ КАВАЛЕРЫІ"

Пад непасрэдным кіраўніцтвам ЦК КП(б)Б БССР на 20 дзён раней мінулага году закончыла веснавую сяўбу. Засеяна 2.682 тыс. га. Такога посьпеху ў сяўбе мінулага году мы дабіліся дзякуючы разгрому сабатажу кулацкіх элемэнтаў у часе збожжазагатовак, умацаваньню калгасаў, росту і згуртаваньню ў іх савецкага актыву, стварэньню палітаддзелаў і мабілізацыі шырокіх мас калгаснікаў вакол лёзунгу партыі — «зрабіць усіх калгаснікаў заможнымі».

Веснавая пасеўная кампанія праходзіла ва ўмовах выключнага, на сваёй магутнасьці, працоўнага ўздыму, росту сацыялістычнай сьвядомасьці калгасных мас і павароту іх да бальшавіцкай барацьбы за лепшую арганізацыю зямлі і высокую якасьць сяўбы.

Посьпех пасеўнай павінен быць замацаван перамогай прапалачнай і ўборачнай кампаній, сваячасовай і поўнай здачай прадукцыі сельскай гаспадаркі дзяржаве.

Адзэй з важнейшых задач, якія засьпечваюць узьняцьце ўраджайнасьці, зьяўляецца поліва. У БССР павінна быць праполана: агародаў 75 тыс. га, ільну — 260 тыс. га, збожжавых яравых — 500 тыс. га і інш. тэхнічных культур — 20 тыс. га. Апрача таго павінна быць апрацавана 620 тыс. га бульбы і 30 тыс. га карныплодаў.

Гэта работа зьяўляецца ня менш важнай, чым правядзеньне веснавой сяўбы, і таму патрабуе выключнай увагі і ўменьня арганізаваць і расставіць рабочую сілу ў калгасах, саўгасах, каапгасах такім чынам, каб сваячасова і добраякасна правесьці поліва. Посьпех прапалачнай і ўборачнай кампаній будзе выражаны вытворчай калгасная брыгада. Адсюль задача далейшага ўмацаваньня брыгады, праверка заданьняў кожнай брыгадзе на час прапалачнай і ўборачнай, праверка расстаноўкі рабочай сілы ў брыгадзе, вылучэньне ўнутры брыгад спэцыяльных зьвеньняў у 5-10 чал. для правядзеньня па пэўных вучастках ўсіх работ на апрацоўцы і ўборцы гародніны.

Праверыць пастаноўку ўлікі працы ня толькі кожнай брыгады, але і кожнага калгасніка ў брыгадзе як па колькасьці, так і на якасьці.

Улічваючы, што для правядзеньня поліва павінна быць прыцягнута апрача дарослага насельніцтва вялікая колькасьць моладзі, — задача заключаецца ў тым, каб гэту моладзь правільна скарыстаць і ўмела расставіць на рабоце. Да кожнага дарослага вопытнага работніка павінны быць прымацаваны, прыкладна, 2-3 падросткі, якія пад практычным кіраўніцтвам вопытных работнікаў прыняцуць вялікую вытворчую дапамогу.

Першая праполка павінна быць закончана не пазьней 25 чэрвеня. Памятайце, што праполка гародніх культур, ільну, бульбы і інш. у канчатковым разрахунку выражае пытаньне павышэньня ўраджайнасьці і што поліва ў дзесяць раз каштоўней, калі яно будзе праведзена сваячасова і добраякасна.

Побач з полівам павінна быць праведзена работа па падрыхтоўцы і рамонту ўборачных машын і поўнасьцю скончана ворыва чыстых папараў у колькасьці 420 тыс. га да 25 чэрвеня.

Улічваючы вопыт веснавой пасеўнай кампаніі, нельга дапусьціць паўтарэньня памылак, якія выявіліся ў позьнім, часамі нядобраякасным рамонце, і гэта ў значнай ступені тармазіла сваячасовае сканчэньне сяўбы ў радзе раёнаў.

Праверыць у кожным раёне ўсе саўгасы, калгасы, МТС, што імі практычна зроблена па рамонце машын. Такама праверыць якасьць ужо адрамантаваных машын. Адрамантаваныя машыны змазаць і паставіць пад навесь і інш. закрытыя памяшканьні.

Праверыць работу Белсельснабу, яго аддзяленьняў і баз у справе прасоўваньня імі ўборачных машын, запасных частак і інш. абсталяваньня да прапалачнай і ўборачнай кампаній, у прыватнасьці, праверыць ход рэалізацыі нядахазых і ня маючых адносін да сельскай гаспадаркі прадметаў шырокага ўжытку.

Праверыць Белкаапсаюз, райсаюзы і сельспажыўтаварыствы, як яны завозяць і снабжаюць сельскую гаспадарку косамі, сярпамі, бабкамі, малаткамі і інш. прыладамі, неабходнымі для ўборачнай кампаніі.

Праверыць ход вырабу ў МТС, саўгасах, калгасах прасьцейшых дастасаваньняў на барацьбе са стратамі — збожжаўлоўнікаў, брызантаў і інш.

Праверыць у калгасах, саўгасах адкрыцьцё ясьлей, дзіцячых пляцовак, сталовак і інш. бытавых устаноў, якія адыгрываюць выключна важную ролю ў справе вызваленьня для прапалачнай і ўборачнай кампаній значнай колькасьці жаночай рабочай сілы.

Праверыць ход падрыхтоўкі кадраў. Посьпех справы вырашаюць людзі, таму падбору кадраў трактарыстаў, конюхаў, вагаўшчыкоў, вучотчыкаў, работнікаў на ўборачных машынах, ільнацерабілках, малатарнях павінна быць аддана выключная ўвага; як ідзе падрыхтоўка масавых кадраў і як праводзіцца адбор калдзьлікаў на курсы.

Ва ўсім цыкле сельска-гаспадарчых работ і ў транспартавальнай с.-г. прадуктаў конь адыгрывае рашаючую ролю. Праверыць ягчэ раз, як практычна праводзіцца ў жыцьцё дырэктывы партыі і ўраду аб кані. Усе коні да ўборкі павінны выйсьці здаровымі і працаздольнымі. Адвесьці лепшых пажасьці выпасы і арганізаваць бязупынную круглясутачную пасьбу слабых коняй і іх падкормку, мабілізуючы для гэтага ўнутрыкалгасныя рэсурсы.

Праверыць гатоўнасьць калгаснага транспарту: калёс, збруі, наяўнасьць калёснай мазі і іншых «дробязяй», якія нярэдка ўносяць буйныя напаўзі ў канцылярска-бюракратычныя пляны і зрываюць практычную работу.

Праверыць стан супрацьпажарных машын і інвэнтару і пастаноўку справы на ахове калгаснага ўраджаю і маемасьці ад раскрадваньня з боку зладзеяў, лодыраў, кулакоў і падкулачнікаў.

Праверыць ва ўсіх раёнах, МТС, сельсаветах, калгасах пастаноўку ўлікі і сваячасовага адпраўленьня яго вышэйшым органам.

Улічваючы, што ўлік адыгрывае вялікую ролю ў справе сваячасовага дыферэнцыяванага кіраўніцтва кожным раёнам, МТС, калгасам і сельсаветам, неабходна ўстанавіць ва ўсіх МТС і ў найбольш рашаючых калгасах, саўгасах і сельсаветах пасты грамадзкіх кантралёраў на справаздачнасьці, на якіх усклясьці абавязкі па праверцы і сваячасовай адпраўцы ўстаноўленай справаздачнасьці вышэйшым органам.

Кожная камсамольская арганізацыя і кожны камсамолец павінны паставіць сваю работу так, каб максымальна засьпечыць сваім удзелам посьпех чарговых сельска-гаспадарчых кампаній і гэтым стварыць умовы для поўнага і датэрміновага выкананьня кожным калгасам і кожным аднаасобным дваром здачы (паставкі) збожжа, бульбы і інш. сельска-гаспадарчых прадуктаў дзяржаве.

Многатысячны баявы камсамол Беларусі, шляхам разгорнутай масавапалітычнай работы, шляхам уцягненьня мільённых мас працоўных у справу барацьбы за ўраджай разаб'е чыпоўніцкае благадушша, бюракратычную коснасьць і непаваротлівасьць і забясьпечыць БССР, над кіраўніцтвам ЦК КП(б)Б, першае месца па пасьпяховым заваршэньні чарговых сельска-гаспадарчых работ — вороўе папараў, поліве, уборцы ўраджаю і здачы с.-г. прадуктаў дзяржаве.

ПАМ. СТАРШЫНІ СНК І НАРОДНЫ КАМІСАР ЗЯМЛЯРОБСТВА БССР **К. БЭНЭК.**

Аб пастаноўцы аддзелаў лістоў у цэнтральных і раённых газэтах БССР

Пастанова сакратарыяту ЦК КП(б)Б ад 16 чэрвеня 1933 г.

1. ЦК КП(б)Б адзначае фармальна-бюракратычныя адносіны рэдакцыі Лагойскай раённай газэты «Чырвоная Лагойшчына» да пастаноўкі на старонках газэты разгорнутага аддзелу лістоў ад рабочых і калгаснікаў. Факт незьмяшчэньня на старонках раённай газэты ніводзнага лісту рабочага і калгасніка на працягу апошняга месяца ЦК разглядае, як простае ігнараваньне рэдактарам тав. Чашлінскім указаньняў ЦК аб тым выключна важным значэньні, якое мае зьмяшчэньне сыстематычнага аддзелу лістоў рабочых, калгаснікаў і беднякоў, сераднякоў—аднаасобнікаў, а так сама забясьпячэньне пасьлядоўнага кантролю і барацьба за дзейнасьць гэтых лістоў.

За ігнараваньне ўказаньняў ЦК рэдактару газэты «Чырвоная Лагойшчына» тав. Чашлінскаму абвясьціць суровую вымову і папярэдзіць, што адсутнасьць у бліжэйшыя-ж дні рашучай перабудовы газэты пацягне за сабой яшчэ больш сур'ёзную пастаноўку пытаньня аб рэдактару газэты.

2. Ухваліць мерапрыемствы Культпропу ЦК па арганізацыі масавай выбарачнай праверкі работы цэнтральных і раённых газэт па пытаньні пастаноўкі аддзелаў лістоў і барацьбе за іх дзейнасьць. Даручыць Культпропу ЦК не пазьней 22 чэрвеня 1933 году ўнесьці на зацьверджаньне ЦК праект вычарпальных канкрэтных мерапрыемстваў па карэнным паляпшэньні ні пастаноўкі аддзелу лістоў у газэтах, а таксама даць адзінку работы ў гэтай галіне асноўных цэнтральных і раённых газэт.

3. 25 чэрвеня склікаць усебеларускую нараду рэдактароў раённых газэт з выклікам рэдактароў асноўных фабрычных газэт і газэт палітаддзелаў МТС, на якой побач з пытаньнямі над рыхтоўкі да ўборачнай кампаніі і пра вядзеньня загатовак таксама прапрацаваць пытаньне аб пастаноўцы аддзелу лістоў у газэтах. Зацьверджань не абвесткі дня і дакладчыкаў даручыць Культпропу ЦК, Камітэту друку СНК забясьпечыць пакрыцьцё выдаткаў па нарадзе.

4. Папярэдзіць рэдакцыі ўсіх цэнтральных і раённых газэт БССР аб неабходнасьці неадкладнага забясьпячэньня на справе выкананьня дырэктыў ЦК КП(б)Б аб тым выключна вялікім значэньні, якое мае аддзел лістоў.

5. Гэту пастанову апублікаваць у друку і прапрацаваць на пачарговых адкрытых сходах парт'ячэек рэдакцый цэнтральных і раённых газэт.

Сакратар ЦК КП(б)Б — ГІКАЛО.

За дзейнасьць лістоў працоўных

Наша прэса мільёнамі ніцяй зьвязана з шырокімі працоўнымі масамі. Пры дапамозе друку партыя гаворыць з масамі штодзенна і штогадзінна на зразу мелай і роднай им мове. Адсюль з усёй яснасьцю вырысоўваецца тое вялізарнейшае значэньне лістоў рабселькораў і працоўных, якія пасылаюцца ў наш бальшавіцкі друк.

Уладзімер Ільліч з упасьцівай яму пранікнівасьцю і выразнасьцю вызначыў тыя эсноўныя шляхі, па якіх павінен ісьці наш друк па ўцягненьні ў яго работу шырокіх працоўных мас. У пісьце да тав. Барыса аб газэце «Вперед» Ільліч пісаў: «Гэта непаразуменьне, быццам-бы іменна пітаратары і толькі пітаратары (у прафэсыянальным сэнсе гэтага слова) здольны з посьпехам прымаць удзел у органе; наадварот, орган будзе жывым і цікавым толькі тады, калі на пяток кіруючых і пастаянна пішучых пітаратараў прыдзецца 500 і 5.000 работнікаў не пітаратараў». У гэтых словах Ільліча закладзен зьмест работы камуністычнай прэсы з масамі.

Пад кіраўніцтвам партыі Леніна—Сталіна друк дабіўся вялізарнейшых посьпехаў. У мільёнах экзэмпляраў выпічваюцца тыражы газэт, выраз у колькасных і якасных адносінах друк у на цыянальных рэспубліках. Рабселькораўскі рух ператварыўся ў рух мільёнаў.

Рост бальшавіцкай прэсы і арміі рабселькораў ёсьць выяўленьне самаахвяркай адданасьці працоўных мас нашай партыі і яе магутнай найвастрэйшай зброі—бальшавіцкай прэсе.

Вось чаму задача ўсіх газэт заключаецца ў тым, каб асабліва чупа, асабліва клапатліва адносіцца да кіраўніцтва вялізарнейшай арміяй рабселькораў, да задаваленьня самых надзенных запатрабаваньняў мас, накіраваных на справу будаўніцтва сацыялізму.

З ростам працукуючых сіл нашай краіны нязьмерна высока ўзрос палітычны і культурны ўзровень працоўных. Кастрычніцкая рэвалюцыя выклікала да жыцьця вялізарнейшыя пласты працоўных, якія раней былі прыгнечаны царызмам. Гэта асабліва адносіцца да нацыянальных рэспублік і акраін. Зараз патрэбнасьць гэтых мас у ведах з тым, каб больш пасьпяхова накіраваць сваю ўвагу да будаўніцтва сацыялізму,—значна выраслa. Друк аба вязан задавальняць гэтыя зусім законныя іх патрабаваньні. Ільліч заўсёды ставіў нашаму друку задачу—уцягнець не ў яго работу рабочых і працоўных мас. Ён гаварыў: «Давайце шырэйшую рабочым магчымасьць пісаць у нашу газэту, пісаць цалкам аб усім, пісаць, як можна больш, аб штодзенным сваім жыцьці, інтарэсах і рабоце. Бяз гэтага матар'ялу грош будзе цана сацыял-дэмакратычнаму органу і ня будзе ён заслугоўваць назвы сацыял-дэмакратычнага». (Чытай-бальшавіцкага, гутарка ідзе аб газэце «Вперед». (Рэд.).

Цэнтральны орган нашай партыі «Правда» паказвае сапраўдныя ўзоры, як трэба адносіцца і рэагаваць на тыя лісты і матар'ялы, якія пасылаюцца ў газэту. Няма магчымасьці ў адным газэтным артыкуле ахапіць хоць-бы прыблізна той вялізарнейшы матар'ял, які ўзьнімаюць працоўныя масы праз наш друк. Вялікая каштоўнасьць яго асабліва ў тым, што рабочыя і працоўныя масы праз друк усьпрыймаюць цэлы рад скажэньняў лініі партыі на асобных вучастках, пішуць аб асобных непададках, уносяць рад прапаноў, якія паляпшаюць работу тых або іншых зьвеньняў, пішуць аб надзенных пытаньнях і г. д. Узорам таго, як трэба рэагаваць на лісты рабселькораў, прыводзем яркі прыклад з лістом настаўніка Сьцяпуры. Тут «Правда» паказала сапраўдную бальшавіцкую апэрацыйнасьць, увагу і чулапасьць. За гэтым фактам, аб якім пэведамлялася ў пісьце, «Правда» здолела паказаць тыя памылкі, якія мэліся ва ўсёй КП(б)Б у нацыянальным пытаньні. Каштоўнасьць заключаецца і ў тым, што «Правда», указваючы на асобныя недахопы, разам з тым апэрацыйна дапамагае іх зьнішчэньню, вучыць, як трэба працаваць.

Вучачыся на бальшавіцкіх традыцыях «Правды», наш друк павінен перабудоўваць сваю работу. У прэсу БССР паступае таксама вялізарная колькасьць лістоў рабочых і сялянскіх карэспандэнтаў. Колькасьць іх лічыцца тысячамі. Чупа рэагаваць на іх, змагацца з бюракратычнымі скажэньнямі, змагацца за іх дзейнасьць—вось задача ўсіх газэт. Трэба проста сказаць, што газэты яшчэ не заўсёды выразна праводзяць работу з рабселькорамі і з допісамі працоўных. Гэта цалкам адносіцца і да самой «Зьвязды». У нас яшчэ не заўсёды хутка і поўна адбываецца рэагаваньне на ўсе паступаючыя матар'ялы. Вось чаму перабудова работы нашага друку з пункту гледжаньня большага ўцягненьня ў яе работу рабочых і сялянскіх карэспандэнтаў, з пункту гледжаньня хуткага і поўнага рэагаваньня на лісты працоўных, барацьбы за іх дзейнасьць набывае выключна важнае значэньне.

Надрукаваная сёньня пастанова ЦК аб газэце «Чырвоная Лагойш

Пазыка другой пяцігодкі

Бальшавіцкімі тэмпамі, шырокай масавай работай выцягнуць аднаасобны сэктар з глыбокага прарыву

работа Верашынскага сельсавету—лепшы адказ апартуністам

БАБРУЙСК. (Наш кар.).

Рэалізацыя пазыкі другой пяцігодкі па Бабруйскім раёне характарызуецца наступнымі лічбамі. Па групе рабочых і служачых кантрольнае заданьне выканана на 97 проц.; па неарганізаваным гарадзкім насельніцтве — на 87 проц., па калгасах — на 161 проц. і па аднаасобным сэктары — на 1,7 проц. Замест 350.000 р., вызначаных па плану, рэалізавана толькі 6.000 руб.

Гэтыя лічбы дакладна характарызуюць работу бабруйскіх арганізацый, да гэтага часу яшчэ нават не скончана падпіска сярод рабочых і служачых.

Той факт, што сярод аднаасобнікаў рэалізавана толькі 1,7 проц. заданьня паказвае, што ў Бабруйскім раёне злачынна ігнаруецца работа па аднаасобным сэктары.

Поўнае выкананьне пляну пазыкі калгасным сэктарам гаворыць аб росьце сьвядомасьці калгасьнікаў і палепшэньні іх матар'яльнага становішча. Але, з другога боку, гэты факт сьведчыць аб тым, што бабруйскія арганізацыі пайшлі на лініі найменшага супраціўленьня. **Яны зусім закінулі такі адказны вучастак падпіскі, як аднаасобны сэктар.**

Чым-жа тлумачыцца аставаньне аднаасобнікаў?

Перш за ўсё тым, што парт'ячэйкі і сельсаветы не апрымліваюць належнага кіраўніцтва з боку райкому і РВК і не праводзяць масава-растлумачальнай работы. Напрыклад, у **Падрэскім** сельсавеце большасьць насельніцтва складаюць аднаасобнікі. Нытаньне аб пазыцы там ні разу глыбока не абгаворвалася, гаварылі толькі ў бягучых справах, пасьля сходу. І ў выніку гэтага плян пазыкі рэалізован толькі на 8 проц.

Можна прывесьці яшчэ шмат прыкладаў. Гарбацэвіцкі сельсавет заданьне па разьмяшчэньні пазыкі выканаў на 22 проц., Батушацкі — на 23 проц. і г. д.

Зусім няправільна было-б сьцьвярджаць, што аднаасобнікі ня хочуць падпісвацца на пазыку. Гэту апартуністычную хлусьню можна пачуць толькі ад пераражэнцаў, ад такіх людзей, як старшыня Правянскага сельсавету **Вэкнер** і сакратар парт'ячэйкі **Пінчук.** Лепшым адказам на гэта служыць такі факт. Сяляне вёскі Тажылавічы ў парадку самаабавязацельства падпісаліся на 2.000 руб.

Там, дзе сярод працоўных аднаасобнікаў праведзена растлумачальная работа, ёсьць добрыя вынікі. Прыкладам можа служыць **Верашынскі** сельсавет, які выканаў плян рэалізацыі пазыкі на 109,3 проц. Такой перамогі ён дабіўся толькі дзякуючы разгортваньню шырокай масавай работы сярод аднаасобнікаў. **Ч.**

ЧАРАДУЮЦЬ КАМПАНІІ

Рэалізацыя пазыкі другой пяцігодкі ў Крупскім раёне пачалася тыдні два таму назад. Аднак зроблена вельмі мала. Райкомы КП(б)Б і ЛКСМБ не зьвярнулі па гэту важную гаспадарча-палітычную кампанію належнай увагі. Шмат было шуміхі, бліскучых рэзалюцый, але канкрэтнай работы ня было.

Праект пастановы па рэалізацыі пазыкі абгаворан на бюро райкому КП(б)Б, разаслалі інструкцыі па сельсаветах і на гэтым супакоіліся.

РВК таксама абмежаваўся пастановай і мерапрыемствамі, людзей у вёску паслалі толькі пасьля патрабаваньня Менскай буксірнай брыгады.

Сакратар райкому КП(б)Б замест таго, каб кіраваць пасланымі людзьмі, цесна ўвязваць іх работы з сяўбой, катэгарычна забараніў займацца пазыкай да таго часу, пакуль першая кампанія ня будзе скончана. Букцірнай брыгадзе вызначылі адзін сельсавет, а пра астатніх—справа ня ваша—заявіў сакратар РК.

Як ідзе рэалізацыя пазыкі па раёне—ніхто добра ня ведае. Весткі, якія даюцца Наркамфіну і кіраўніцтву ашчадкас, не адпавядаюць сапраўднасьці. Смародзінскі, Сакалоўскі, Абчуцкі і іншыя сельсаветы зусім ня лічаць патрэбным дасылаць весткі ў райашчадкасу аб ходзе пазыкі і гэтым зрываюць улік.

Райашчадкаса працуе дрэнна, інструктары **Мікульскі і Піліпенка** замест таго, каб кіраваць кампаніяй падпіскі паехалі кудысьці ў раён.

Досыць спадзявацца на самацёк. Райком партыі павінен узначаліць кампанію рэалізацыі пазыкі. Апартуністычным разважаньням аб чарговасьці кампаніі трэба даць рашучы адпор.

Брыгадзір.

Прыцягнуць вінаватых да адказнасьці

Быхаўскі раён на працягу доўгага часу ўтрымоўвае чорны сьпіс раёнаў, якія зрываюць рэалізацыю пазыкі другой пяцігодкі.

Здавалася-б, што раённыя партыйныя, савецкія і прафсаюзныя арганізацыі павінны былі з гэтага зрабіць здаведныя высады і карэнным чынам перабудаваць сваю работу з тым, каб у бліжэйшы час ня толькі поўнасьцю выканаць заданьне, але і перавыканаць яго.

Гэтага ня зроблена. У выніку на 5 чэрвеня плян рэалізацыі пазыкі па раёне выкананы толькі на 53 проц., у тым ліку па аднаасобным сэктары—на 0,6 проц.

У чым справа? Чым тлумачыцца такі ганебны прарыў у рэалізацыі пазыкі?

Прычына заключаецца ў тым, што раённыя арганізацыі, і ў першую чаргу кредытна-фінансавыя ўстановы ігнаруюць дырэктывы партыі і ўраду аб належнай кіраўніцтва з боку райкому і РВК і не праводзяць масава-растлумачальнай работы. Напрыклад, у **Падрэскім** сельсавеце большасьць насельніцтва складаюць аднаасобнікі. Нытаньне аб пазыцы там ні разу глыбока не абгаворвалася, гаварылі толькі ў бягучых справах, пасьля сходу. І ў выніку гэтага плян пазыкі рэалізован толькі на 8 проц.

Можна прывесьці яшчэ шмат прыкладаў. Гарбацэвіцкі сельсавет заданьне па разьмяшчэньні пазыкі выканаў на 22 проц., Батушацкі — на 23 проц. і г. д.

Зусім няправільна было-б сьцьвярджаць, што аднаасобнікі ня хочуць падпісвацца на пазыку. Гэту апартуністычную хлусьню можна пачуць толькі ад пераражэнцаў, ад такіх людзей, як старшыня Правянскага сельсавету **Вэкнер** і сакратар парт'ячэйкі **Пінчук.** Лепшым адказам на гэта служыць такі факт. Сяляне вёскі Тажылавічы ў парадку самаабавязацельства падпісаліся на 2.000 руб.

Там, дзе сярод працоўных аднаасобнікаў праведзена растлумачальная работа, ёсьць добрыя вынікі. Прыкладам можа служыць **Верашынскі** сельсавет, які выканаў плян рэалізацыі пазыкі на 109,3 проц. Такой перамогі ён дабіўся толькі дзякуючы разгортваньню шырокай масавай работы сярод аднаасобнікаў. **Ч.**

Прапрацоўка пастановы аб сельска-гас падарчым падатку ў калгасе «Камінтэрн», Рубілкаўскага сельсавету Дзяржынскага раёну.

Месячнік лесавывазкі

НАГНАЦЬ ПРАПУШЧАНАЕ, ВЫКАНАЦЬ ПЛЯН ДРУГОГА КВАРТАЛУ

Першыя два месяцы другога кварталу далі зусім нязначнае выкананьне пляну лесазагатовак і вывазкі. Па загатоўках дроў квартальнае заданьне было выкавана на 29,8 проц., па вывазцы дроў—на 4,2 проц.

СНК БССР і ЦК КП(б)Б у сваёй пастанове канстатавалі, што такое становішча **«тлумачыцца выключна дэмабілізацыйнымі настроямі і бязьдзейнасьцю апарату леспрамгасаў і зусім слабой увагай справе дрова-лесазагатовак і вывазцы з боку Лесбелу і большасьці раённых кіруючых арганізацый».** Для ліквідацыі прарыву ў загатоўках дроў і вывазцы лесу СНК і ЦК з першага чэрвеня па першае ліпеня абвясьцілі ўдарны месячнік і абавязалі **«леспрамгасы, прафсаюзныя арганізацыі, работнікаў лесу і сплаву, гаркомы і райкомы КП(б)Б і палітаддзелы МТС разгарнуць шырокую масавую работу па растлумачаньні калгасьнікам і аднаасобнікам—бедняком і сярэднякам неабходнасьці і абавязанасьці выкананьня прынятых самаабавязацельстваў».**

Як-жа ажыцьцяўляюцца раённымі арганізацыямі гэтыя балявыя ўказаньні партыі і ўраду? Вельмі нездавальняюча. Пра гэта перш за ўсё гавораць лічбы выкананьня пляну за першую дэкаду месячніка. Так, дроў замест 228 тыс. кубаметраў загатоўлена толькі 70 тыс., што складае 30,7 проц. дэкаднага заданьня, або 0,9 проц. месячнага. Бутматар'ялаў за дэкаду трэба было вывезьці 139 тыс. кубаметраў, а вывезена 64 тыс., што складае 64 проц. дэкаднага заданьня, або 0,9 проц. месячнага. Дэкаднае заданьне па вывазцы дроў складала 135 тыс. кубаметраў, а вывезена 34 тыс., або 25,4 проц.

Такім чынам як па загатоўках, так і па вывазцы першая дэкада месячніка па сутнасьці ніякага пералому не дала. Тлумачыцца гэта тым, што з боку большасьці леспрамгасаў і раённых арганізацый усё яшчэ няма належнай разварушанасьці, не адчуваецца бальшавіцкіх адносін да такога важнейшага вучастку сацыялістычнага будаўніцтва, як лесазагатоўкі. Можна прывесьці цэлы рад фактаў, калі некаторыя райкомы і райвыканкомы, прыняўшы пастановы аб разгортваньні месячніка, назаўтра пра яго зусім забылі, і справа лесазагатовак і вывазкі як і раней ідзе самацёкам.

Узяць хоць-бы **Касьцюковіцкі** раён. Там райком партыі да нытаньня месячніка падышоў фармальна, недаацаніў яго значэньня, як важнейшага мерапрыемства, накіраванага на пасьпяховае выкананьне лесазагатоўчага пляну.

Такія-ж адносіны да месячніка праявілі **Плешчаніцкі, Заслаўскі, Асіпавіцкі і Глускі** райкомы партыі. Яны таксама абмежаваліся фармальным прыняцьцем пастановы па разгортваньні месячніка, па сутнасьці-ж ніякай работы не праводзяць. І няма чаго ажыцьцяўляцца, што ў гэтых раёнах за першую дэкаду месячніка дэкаднае заданьне па лесавывазцы выканана ад 4 да 3 проц.

Многія кіраўнікі леспрамгасаў—**Бягомльскага, Крупскага, Клічаўскага, Парычкага, Нараўлянскага, Рагачоўскага і інш. імкнуцца апраўдаць сваю бязьдзейнасьць спасыланьнямі на дрэннае надвор'е, гразкую дарогу.**

— Дажджы і гразкая дарога—аспоўная прычына зрыву пляну лесавывазкі—заяўляюць яны.

Але гэтыя па сутнасьці апартуністычныя разважаньні ўшчант разьбіваюцца ўдарнай работай такіх леспрамгасаў, як **Жыткавіцкі, Старобінскі, Любаньскі, Спуцкі, Прапойскі, Чырвона-Слабодзкі і Тураўскі.** Як вядома, амаль усе гэтыя леспрамгасы ахапляюць тэрыторыю **Палесься** і ўмовы работы там у сэнсе якасьці дарог значна горшыя, чым у цэнтральных і паўночных раёнах. Аднак, яны з посьпехам выконваюць свае планы лесавывазкі. Старобінскі леспрамгас, напрыклад, за першую дэкаду месячніка **дзелавой драўніны вывез 46 проц. месячнага пляну і дроў—29 проц., дэкаднае заданьне ім выканана на 130 проц. Любаньскі** — сёньня рапартуе аб поўным выкананьні пляну лесазагатовак і вывазкі другога кварталу. Добрыя результаты работы далі за першую дэкаду месячніка і ўсе іншыя вышэй пералічаныя леспрамгасы.

Чаму гэтыя раёны дабіліся такіх посьпехаў? Таму, што іх кіраўнікі пабальшавіцку ўзяліся за ажыцьцяўленьне ўказаньняў ЦК і СНК, таму, што там не абмяжоўваліся фармальным прыняцьцем пастановаў аб месячніку, а намячалі канкрэтныя мерапрыемствы, даводзілі іх да сельсавецтаў, калгасаў вёсак, таму, што там на барацьбу з кулацкім сабатажам лесавывазкі мабілізаваны шырокія масы калгасьнікаў і працоўных аднаасобнікаў.

Посьпехі работы гэтых раёнаў паглядна паказваюць, што справа ня ў дрэнным надвор'е і гразкай дарозе, а ў добрым кіраўніцтве лесазагатоўкамі, ва ўменьні правільна спалучыць задачы ўсіх важнейшых гаспадарча-палітычных кампаній. Там-за, дзе партыйныя, прафсаюзныя і савецкія арганізацыі лічаць лесазагатоўкі чыста ведамственай справай і выпускаюць гэты вучастак з-пад сваёй увагі, там уся работа праходзіць самацёкам, і ў выніку плян зрываецца.

Адна з асноўных задач, пасьпяховае ажыцьцяўленьне якой забясьпечвае і пасьпяховае правядзеньне ўдарнага месячніка,—гэта давядзеньне да кожнага калгасу і вёскі ў парадку самаабавязацельстваў поўных заданьняў па лесавывазцы. Гэта работа патрабуе вялікай увагі з боку раённых арганізацый. Адными толькі пастановамі і тэхнічным разьвяртаньнем пляну на паперы не абмяжуешся. Патрэбна шырокае абгаварэньне гэтых планаў на сходах калгасаў і вёсак з тым, каб калгасьнікі і працоўныя аднаасобнікі ўзялі на сябе абавязацельствы і на ўдарнаму выканалі даведзеныя да іх заданьні.

ФРОЛАЎ.

Сакратару ЦК КП(б)Б—т. Гікало, старшыні СНК БССР—т. Галадзеду, рэдакцыі газэты „Зьвязда"

Пад кіраўніцтвам ЦК КП(б)Б, мабілізаваўшы калгасы, калгасьнікаў і аднаасобнікаў — бедняковаў і сярэдняковаў, змагаючыся з кулацкім сабатажам, Любаньскі раён плян другога кварталу па загатоўцы і вывазцы лесу выканаў датэрмінова да 15-га чэрвеня.

Загатоўлена дроў 144 проц. квартальнага пляну, вывезена дзелавой драўніны 108,7 проц., дроў — 107 проц. Змагаемся за далейшае перавыкананьне лесазагатоўчага пляну.

РАЙКОМ КП(б)Б **КАВАЛЁЎ.**
РАЙВЫКАНКОМ **КРЫМАЎ.**
ЛЕСПРАМГАС **АСТРОЎСКІ.**

Школьнае будаўніцтва—рашаючы вучастак падрыхтоўкі да навучальнага году

Школьнае будаўніцтва і рамонт школ зьяўляюцца **рашаючым** вучасткам падрыхтоўкі да новага навучальнага году і патрабуюць асаблівай увагі ўсіх партыйных, савецкіх, прафсаюзных і грамадзкіх арганізацый, у першую чаргу, самі ж ветлічніцкіх мас.

За апошнія гады ў БССР пабудавана сотня новых тыпавых школ на прадпрыемствах, саўгасах, калгасах. Толькі **за 1932 год** у асноўным закончана і здана ў эксплёатацыю **136 чатырохгадовых школ і 27 сямігодак,** прыстасавана пад школы **297 былых кулацкіх будынкаў.**

Ала-ж праграма будаўніцтва выканана толькі на 41 проц.

Адпушчаныя дзяржавай сродкі не скарыстаны поўнасьцю, а асабовыя раёны, як напрыклад, **Чавускі, Лоеўскі, Мазырскі, Менскі** не асвоілі нават і 50-процантных бюджэтных асыгнаваньняў.

Асноўная ўвага ў гэтым годзе павінна быць накіравана на пабудову школ, пачатых у мінулыя гады, і на рамонт школьных будынкаў. **394 школы, у тым ліку і 14 поўных сямігодак павінны быць поўнасьцю закончаны да пачатку навучальнага году.**

Размер капітальных укладаньняў на дабудову школ і палітасьветных устаноў, апрача **1.454.800 руб.,** адпушчаных на рамонт, у гэтым годзе павялічан да **7.740.800** руб. супроць 4.848.400 руб. у мінулым годзе. Разьмер гэтых капітальных укладаньняў поўнасьцю забясьпечвае выкананьне праграмы будаўніцтва. Неабходна толькі шырока разьвіць і скарыстаць дапамогу насельніцтва, эканомна траціць сродкі, дабіўшыся на справе ажыцьцяўленьня дырэктыў аб зьніжэньні кошту будаўніцтва.

Будаўнічы сэзон у самым разгары, але **стансвішча школьнага будаўніцтва ўжо зараз прымушае біць трывогу.**

Недаацэнка гэтага важнейшага вучастку работы, спасыланьне на труднасьці, «аб'ектыўныя» прычыны паўтараюцца і ў гэтым годзе.

Для Стара-Дарожскага РВК, мабыць, неабавязкова пастанова СНК БССР ад 12-V—1932 г., дзе былі даны канкрэтныя дырэктывы па ліквідацыі прарыву ў школьным будаўніцтве. Апошняе было сарвана ў мінулыя два гады. Але і ў гэтым годзе школьнае будаўніцтва пад пагрозай зрыву. **З 5 незакончаных школ будуецца толькі адна,** а на дзіцячы ачаг ня вывезена нават і лесаматар'ял.

Мсьціслаўскі РВК замест максымальнага скарыстаньня мясцовых рэсурсаў, для дабудовы школ, якія пачалі будаваць яшчэ ў 1931 г., абмежаваўся пагрозаньнем Наркамасьветы, што калі не дашлюць цьвікоў і шкла, дык зьнімае з сябе адказнасьць як за «нешчэ будаўніцтва, так і цэласьць пабудаванага».

Будаўніцтва **Гайнскай сямігодкі, Лагойскага раёну,** сарвана ў мінулым годзе з-за адсутнасьці лесаматар'ялу і ў гэтым годзе лес да пабудовы не падвезен.

Дзяржынскі РВК, ня гледзячы на прапановы Наркамасьветы пачаць будаўніцтва польскай сямігодкі, яшчэ і да гэтага часу «вырашае», які матар'ял загатовіць і на колькі паверхаў будаваць школу.

Падобныя факты не адзінкавыя, яны маюць месца і ў іншых раёнах.

Яны, гэтыя факты, сьведчаць перш за ўсё аб тэй апартуністычнай недаацэнцы школьнай справы, якая ёсьць у радзе месц. За гэтыя прарывы школьнага будаўніцтва перш за ўсё адказваюць партыйныя камітэты, партыйныя ячэйкі па месцах.

Лагойскі, Дзяржынскі, Жыткавіцкі, Чавускі, Лоеўскі, Мазырскі райкомы КП(б)Б павінны неадкладна забясьпечыць належны пералом у справе барацьбы з кулацкім сабатажам, у справе ажыцьцяўленьня ў тэрмін плянаў школьнага будаўніцтва. На гэта абавязваюць дырэктывы ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б аб школе, якія ўсклалі на партыйныя арганізацыі абавязак глыбока ўваходзіць у кожную дэталь школьнай справы.

У краіне—гігантскае будаўніцтва, дораг кожны куба-метр лесу, кожны кілёграм дахавага жалеза. Таму ніводнага ўдаваньня, ніводнага ўвязваньня ня трывае. Ня будуецца на базе электраэнэргіі (Рыбінзе), багацьцем на базе мясцовага вугалю. Фарфоравы завод — гэта толькі частка камбінату фэра-сплавоў. Камбінат фэра-сліцітавы завод — дукцыйнасьцю ў 32 тыс. тон, фэрабідэнавы завод (300 тон), фэрасілікавы завод — 20 тыс. тон, завод электрыцкавай сталі — 50 тыс. тон.

Зэстафоні ператварацца ў буйны цэнтр мэталюргічнай прамысловасьці Грузіі, у ачаг вырабу высакаякаснай сталі. **(«Заря Востока»).**

ЧЫГУНАЧНЫ МОСТ ПРАЗ ВОЛГУ

У Горкім разгарнулася будаўніцтва чыгуначнага моста праз Волгу, зьвяжа Маскоўска-Курскую чыгунку. Паўночная 1 злучыць маскоўскую магістраль. Зараз пераправа ідзе за Волгу робіцца паромам, больш 60 вагонаў у суткі. Набліжэньне моста забясьпечыць просты бесперапынны рух па ўсёй лініі. Вокруг зьяўляецца адной з самых вялікіх чыгуначных пабудоў у СССР. Дакладна — 1.200 мэтраў. З 17 бяконтрольных пор) маста ўжо скончана 14 («Красная Коммуна»).

150 МІЛЬЁНАЎ МЭТРАЎ У ГОД

Тонкая эластычная празрыстая плёнка — основа кінаматэрыялу. Гэты год ва ўсім сьвеце выдаткуецца больш 1 мільярда мэтраў кінаплёнкі. Зараз у Казані будуецца фабрыка плёнкі, якая будзе самай магутнай толькі ў СССР, але і ў Эўропе. Магутнасьць яе — 150 млн. мэтраў год. Гэта адна шостая частка сучаснай выпрацоўкі. Казанская фабрыка дзе выраблянь усе гатункі плёнкі («Вечерняя Москва»).

ПА ШПАЛЬТАХ СЕНСАЦЫІ СССР

ПЯРШЫНЕЦ ЦЯЖКАЙ ІНДУСТРЫІ ГРУЗІІ

На мэталюргічным заводзе ў Зэстафоні (Грузія) поўнасьцю спыгнаны таж трох фэра-марганцавых электрычак «Герц Гельф», магутнасьцю ў 1 тон у год кожная.

9 чэрвеня пачаліся выпрабаваньні чак на халастым ходу.

18 электрапечак, 150 тыс. тон толькі фэра-марганцу ў год — вытворчыя магчымасьці заводу.

Зэстафонскі завод — першы па гутнасьці ў СССР і адзін з буйнейшых у сьвеце на сваёй тэхнічнай базе. Ён будуецца на базе электраэнэргіі (Рыбінзе), багацьцем на базе мясцовага вугалю. Фэрагранцавы завод — гэта толькі частка камбінату фэра-сплавоў. Камбінат уключаць: фэра-сліцітавы завод з дукцыйнасьцю ў 32 тыс. тон, фэрабідэнавы завод (300 тон), фэрахромавы завод — 20 тыс. тон, завод электрыцкай сталі — 50 тыс. тон.

Зэстафоні ператварацца ў буйны цэнтр мэталюргічнай прамысловасьці Грузіі, у ачаг вырабу высакаякаснай сталі. **(«Заря Востока»).**

ЧЫГУНАЧНЫ МОСТ ПРАЗ ВОЛГУ

У Горкім разгарнулася будаўніцтва чыгуначнага моста праз Волгу, зьвяжа Маскоўска-Курскую чыгунку. Паўночная 1 злучыць маскоўскую магістраль. Зараз пераправа ідзе за Волгу робіцца паромам, больш 60 вагонаў у суткі. Набліжэньне моста забясьпечыць просты бесперапынны рух па ўсёй лініі. Вокруг зьяўляецца адной з самых вялікіх чыгуначных пабудоў у СССР. Дакладна — 1.200 мэтраў. З 17 бяконтрольных пор) маста ўжо скончана 14 («Красная Коммуна»).

150 МІЛЬЁНАЎ МЭТРАЎ У ГОД

Тонкая эластычная празрыстая плёнка — основа кінаматэрыялу. Гэты год ва ўсім сьвеце выдаткуецца больш 1 мільярда мэтраў кінаплёнкі. Зараз у Казані будуецца фабрыка плёнкі, якая будзе самай магутнай толькі ў СССР, але і ў Эўропе. Магутнасьць яе — 150 млн. мэтраў год. Гэта адна шостая частка сучаснай выпрацоўкі. Казанская фабрыка дзе выраблянь усе гатункі плёнкі («Вечерняя Москва»).

ЧАЛЯБІНСКАЯ ДРЭВАСІНА

На здымку: Кацельная II-ой чэрвеня

КАЛГАСЬНІКІ АЗЭРБАЙДЖАНУ ГЕРОЯМ ЛАК-БАТАНУ

Калгасьнікі Нарымаўскага (Азэрбайджан) прыслалі ліст ... лак-батанскіх нафтавых промыслаў, дзе на працяку двух тыдняў звышмагутны нафтавы фантан, заўшым узоры барацьбы са стыхіяй. Лісьце калгасьнікі вішнуюць ... паўдаў з перамогай і выказваюць ... пэнасьць, што яны і надалей ... па-ўдарнаму змагацца на нафтаносным пар герояў Лак-Батану 2.000 калгасьнікаў Нарымапаўскага раёну ... эшалён са сьвежымі с.-г. прадуктамі. Эшалён суправаджаюць лепшыя ... зікі калгасных палёў («Бакинский рабочий»).

Бутомаў і Галкін

ГРАМАДЗКАЕ ХАРЧАВАНЬНЕ—НА СЛУЖБУ ПОЛІВУ, УБОРЦЫ І МАЛАЦЬБЕ

Арганізацыя грамадзкага харчаваньня ў пэрыяд палявых работ у саўгасах, калгасах і МТС набывае вельмі вялікае значэньне ў барацьбе за ўздым сельска-гаспадарчай вытворчасьці. Стварэньне сталовак і палявых кухняў для абслугоўваньня рабочых саўгасаў, калгасных брыгад і трактарыстаў—важнейшая ўмова па вынішчэньні прадукцыйнасьці працы і палепшэньня якасьці палявых работ.

Вялікую ролю адыгрывае грамадзкае харчаваньне і ў галіне ўцягненьня калгасьніц у вытворчы працэс. Зусім зразумела, што там, дзе адкрыты сталоўкі, палявыя ачагі, ясьлі і пляцоўкі, жанчына, вызваленая ад хатніх клопат, мае поўную магчымасьць паўдарнаму працаваць на полі.

Гэта значэньне грамадзкага харчаваньня паяўны былі ўлічыць нашы каапэрацыйныя і зямельныя органы. Яшчэ ў пачатку лютага НК РСІ БССР даў выразную дырэктыву аб разгортваньні сеткі сталовак і палявых ачагоў у калгасах, саўгасах і МТС.

Між тым, гэта важнейшая работа фактычна сарвана. **На час сяўбы трэба было арганізаваць 1.065 сталовак і 1.094 ачагі. Адкрыта калі 320 сталовак (29,5 проц.) і 45 ачагоў (4,2 проц.).** У пяці раёнах трэба было арганізаваць ўзорныя сталоўкі. На справе ні адна сталоўка не адкрыта.

Наркамзем і Белкаапхарч правілі яўную недаацэнку гэтай важнейшай задачы, яны не ўсьвядомілі таго, што грамадзкае харчаваньне—важнейшы вучастак барацьбы партыі за палепшэньне матар'яльна-бытавых умоў рабочых і калгасьнікаў.

Толькі 7-га красавіка Наркамзем паведаміў раёнам: «Вам вызначаны наступны арыентовачны плян арганізацыі грамадзкага харчаваньня». Паведаміў са спазьненьнем па два месяцы.

Характэрна, што асабліва дрэнна пастаўлена грамадзкае харчаваньне ў тых раёнах, якія зрываюць сяўбу. **Сіроцінскі** раён не адкрыў ні адной сталоўкі, ні аднаго ачагу. **Гарадоцкі** раён, які павінен быў арганізаваць 30 сталовак, не адкрыў ніводнай. **Бешанковіцкі** раён арганізаваў адну сталоўку замест 15. Такім чынам, гэтыя раёны сарвалі мерапрыемствы па грамадзкім харчаваньні, выпусьцілі шы з рук магутную зброю барацьбы за сяўбу.

Некалькі прыкладаў досыць пераканаўча характарызуюць, як аднесьліся паасобныя зямельныя і каапэрацыйныя арганізацыі да грамадзкага харчаваньня ў калгасах і саўгасах.

Клімавіцкі райсаюз абмежаваўся тым, што зацьвердзіў плян арганізацыі грамадзкага харчаваньня. Ён нічога не зрабіў для таго, каб выканаць гэты плян. Нам. старшыні райсаюзу Віткін заяўляе, што каапэрацыя пры ўсім жаданьні ня можа гэтым заняцца, бо, бачыце, няма спэцыяльнага работніка. Апраўданьне, жвое не заслугоўвае крытыкі! А райсаюз? Ён зусім ня ведае, што робіцца на вучастку грамадзкага харчаваньня. Работнікі райсаюза прыдумалі арыгінальную матышпроўку, каб апраўдаць сваю бязьдзейнасьць. Яны выслалі сваю «тэорыю»: «грамадзкае харчаваньне на сяўбе не патрэбна: сяўба—гэта ж масавыя палявыя работы (?!); гэтым трэба заняцца ў часе ўборкі». Ці варта даказваць усю абсурднасьць гэтай тэорыі? У Клімавіцкім раёне 94 калгасы, а працуюць толькі 9 сталовак і 16 ачагоў.

Сарвалі плян арганізацыі сеткі грамадзкага харчаваньня і **Петрыкаўскі** райсаюз і райза. Райсаюз не патурбаваўся нават скласьці плян абслугоўваньня сяўбы. Ніякіх матар'ялаў аб тым, дзе адкрыты сталоўкі, як яны забясьпечаны інвэнтаром, у каапэрацыі не атрымаеш. А райза? Плян у яго ёсьць, плян даволі шырокі: трэба адкрыць 22 сталоўкі ў калгасах. Але якая цана гэтаму пляну, калі ён застаўся толькі добрым пажаданьнем? Яго прышылі да справы і на гэтым паставілі крыжык. Больш таго, райза проста ня ведае, што робіцца ў калгасах. Ён упэўнена дае весткі, што ў калгасе «Чырвоны Партызан» працуе сталоўка; аказваецца—гэта сталоўка нават на сьвет не нарадзілася. З-за безадказных адносін мясцовых арганізацый да гэтуль не адкрыта ні адной калгаснай сталоўкі—працуюць толькі 7 сталовак у саўгасах.

У **Мазырскім** раёне знаходзіцца 156 калгасаў, тры саўгасы і 1 МТС. Тут вялікае поле дзейнасьці для людзей з ініцыятывай, якія разгорнуць свае задачы і жадаюць працаваць. Аднак, Мазырскі райсаюз менш усяго ўвагі аддаў грамадзкаму харчаваньню. Ён нават ня склаў пляну арганізацыі сталовак. Была прынята агульная пастанова, якая засталася прыгожай рэзалюцыяй і служыць цэлер шырмай для работнікаў райсаюзу: «выбачайце, мы далі дырэктыву». А гэта дырэктыва спакойна падпыта да спраў праўленьняў ССТ. Райза ня можа даказаць па пытаньне, дзе арганізаваны сталоўкі і як яны працуюць. **Поўны самацёк і яўная безадказнасьць!**

Белкаапсаюз даў спэцыяльную дырэктыву Мазырскай каапэрацыі — **палепшыць грамадзкае харчаваньне ў** Даманавіцкай МТС. Гэта прапанова патапула ў канцылярыі. Райсаюз работай сталоўкі Даманавіцкай МТС ня цікавіцца, яна знаходзіцца ў вельмі дрэнным становішчы.

Мазырскі райза рашыў, што грамадзкае харчаваньне яго шчэгул не датычыцца. Ніякіх указаньняў калгасам і сельсаветам ня дадзена. Плян арганізацыі сталовак і ачагоў да месц не даведзен. Загалчык райза **Радзіновіч** па-свойму апраўдвае гэта: «Ня было часу, ёсьць вельмі тэрміновыя справы—сяўба». Ён, як відаць, не разумее, якую цесную сувязь мае арганізацыя грамадзкага харчаваньня з барацьбой за бальшавіцкую сяўбу. Такія адносіны да грамадзкага харчаваньня нельга інакш кваліфікаваць, як апартуністычнае супраціўленьне арганізацыйна-гаспадарчаму ўмацаваньню калгасаў і ўздыму прадукцыйнасьці працы.

Пазнаёміўся зараз з работай сталовак і ачагоў палявых МТС, саўгасаў і калгасаў. Тут адзначаецца ігнараваньне гэтага адказнага вучастку работы. Ніхто ня цікавіцца якасьцю абслугоўваньня трактарыстаў, саўгасных рабочых і калгасьнікаў. Сталоўка працуе, людзі ходзяць, грошы плацяць—ну і добра.

Зірнем у сталоўку **Магілёўскай МТС.** Там няма элементарных гігіенічных умоў. Нідзе на сталах ня ўбачыш цыраты, няма гатаванай вады, няма ў чым мыць нанчыньне. Катлы на лужаньне—прыгатаваныя стравы маюць выгляд сажы. Прадуктаў не хапае, бо кіраўніцтва чакае цэнтралізаваных фондаў і ня думае займацца самазагатоўкамі.

Яшчэ горшы малюнак па **Даманавіцкай МТС.** Дайшло да таго, што на працягу двух дзён у сталоўцы ня было хлеба—адміністрацыя не паклапацілася своячасова атрымаць яго.

Якасьць абедаў нікуды ня вартая. Папуе самы дрэнны стандарт. Штодзенна на першае бурэ, недзваранымі, бяз прыправы. Гарбаты ў сталоўцы ня бывае—адміністрацыя не паклапацілася набыць цукар або цукеркі. Сталоўцы адпушчаны значныя сродкі на разгортваньне самазагатовак, але дагэтуль не загатоўлена ніводнага кілё бульбы, капусты, гуркоў, таматаў, морквы, не гаворачы ўжо аб малочных прадуктах і тлушчох. Між тым, сталоўка мае ўсе магчымасьці разгарнуць самазагатоўкі. МТС зьвязана з 156 калгасамі. Шмат можна было-б зрабіць пры жаданьні, пры бальшавіцкіх адносінах да справы. Мы не гаворым ужо аб агідным санітарным становішчы сталоўкі. Хіба гэта не злачынныя адносіны да культурна-бытавога абслугоўваньня рабочых трактарнага парку?

Далёка няспрыяючыя ўмовы ў саўгасах. Возьмем саўгас **«Петрыкава»,** маслапрамтрэсту. Дом, дзе зьмяшчаецца сталоўка, стаіць побач са стайняй, адтуль праз адчыненыя вокны нясецца ўсякі бруд. У абедзенай залі няма падлогі—замест яе густы пясок. Няма нічога дзіўнага ў тым, што ў памяшканьні пыл асядае на сьценах і сталах. Няма ўмывальнікаў для мыцьця рук, ня знойдзеш цыраты ці абрусаў на сталах. Да гэтага дадамо, што кацёл для прыгатаваньня супу зроблен з бляхі і пялуджаны. Не хапае інвэнтару, лыжак і місак—абедаючым прыходзіцца доўга чакаць, пакуль ім пададуць гэтыя прылады.

У калгасе **«Чырвоны партызан»,** Петрыкаўскага раёну, арганізавалі сталоўку, але якраз напярэдадні сяўбы запялі памяшканьне пад жыльё. «Навошта калгасьніку сталоўка? Ён ня хоча ня, ён і дома можа паесьці», — так заяўляюць члены праўленьня калгасу. Заява гэта — яркае адлюстраваньне спроб клясова-варожых элементаў сарваць грамадзкае харчаваньне і гэтым перашкодзіць ударнай працы па калгасных палёх.

Калі знаёмішся з матар'ялямі аб работе саўгасных і калгасных сталовак, дык відаць ў вочы адно — усюды адзначана **абсалютна нездавальняючае становішча з кадрамі.** Кухары ня толькі ня ўмеюць зрабіць смачны абед, але марна псуюць прадукты. Нашы каапэрацыйныя арганізацыі, у першую чаргу Белкаапхарч, а таксама органы НКЗ правілі шпаваротлівасьць у гэтай справе. Яны нічога не зрабілі, каб падрыхтаваць кадры кваліфікаваных кухароў, каб прыцягнуць на курсы жонак калгасьнікаў і саўгасных рабочых.

Факты паказваюць, што там, дзе калгасы і саўгасы па-баявому ўзяліся за арганізацыю сталовак і ачагоў, там значна павялічылася прадукцыйнасьць працы, там калгасьнікі вельмі ахвотна наведваюць сталоўкі.

Сталоўка калгасу «Чырвоны сьцяг», Церахаўскага раёну, дае штодзенна 150 абедаў, калгасу «На вярце» — ад 200 да 250 абедаў. Калгас імя «Першага мая», Клімавіцкага раёну, адкрыў сталоўку і 6 ачагоў, якія даюць добрыя, сытныя харчы.

Вядомы той вялікі эфэкт, які далі ачагі і развозкі гарбаты, арганізаваныя спажывецкімі таварыствамі Слуцкага і Рагачоўскага раёнаў. Яны адыгралі вялікую ролю ў галіне ўзьнёсьці прадукцыйнасьці працы.

Зараз наступіў самы адказны пэрыяд барацьбы за ўраджай — **праполачная і ўборачная кампанія. На гэтых работах асабліва вялікая ўдзельная вага жаночай рабочай сілы.** Таму вялікае значэньне набывае на гэтым этапе барацьбы за ў

ПАРТЫЙНАЕ БУДАЎНІЦТВА

„Задача чысткі партыі заключаецца ў павышэньні ідэалёгічнага ўзроўню членаў партыі, у палітычным і арганізацыйным умацаваньні партыі, у далейшым узмацненьні давер'я да партыі мільёнаў беспартыйных мас"

(З пастановы ЦК і ЦКК УсеКП(б) ад 28 красавіка г.г.)

Першыя дні чысткі партыі ў Магілеве

(Гутарка з старшынёй райправеркому тав. БАЛЦІНЫМ)

У гутарцы з карэспандэнтам «Зьвязды» старшыня магілеўскай раённай камісіі па чысткі тав. **Балцін** адзначыў:

— Для магілеўскай партыйнай арганізацыі, якая складаецца з 2.734 членаў і кандыдатаў партыі, з якіх 70 проц. уступілі ў партыю ў 1931 1932 г., пытаньне чысткі мае асаблівае значэньне. Гэта значэньне паглыбляецца яшчэ і тым, што ў часе падрыхтоўкі да чысткі Магілеў меў вялікі прарыў ва ўсіх гаспадарча-палітычных кампаніях.

У сваёй тэлеграме на імя сакратара райкому і старшыні РВК, ЦК КП(б)Б і СНК БССР адзначылі, што ў магілеўскай партыйнай арганізацыі ня было сапраўднай барацьбы за сяўбу. Аб тым-жа ня раз сыгналізавала «Зьвязда».

Той факт, што ў раёне па працягу шасьці месяцаў дзейнічала яўна апар тунілстычная дырэктыва райэа аб прыёме «лёяльных» цьвёрдазаданьнікаў у калгас, гаворыць аб адсутнасьці бальшавіцкай пільнасьці ў самой партыйнай арганізацыі.

Партыйная арганізацыя Магілеву мае прарыў ня толькі ў сельскай гаспадарцы. Прамысловасьць Магілеўшчыны таксама працуе слаба. Асаблівае дрэнна працуе завод **«Адраджэнец», швэйная і рымарная фабрыкі**, якія ўвесь час ня выконваюць прамфінпляну. Прадукцыя гарбарні імя Сталіна, гатовае адзеньне швэйнай фабрыкі і збруя рымарнай фабрыкі—зусім дрэнныя. Гэта гаворыць аб тым, што і вытворчыя партыйныя калектывы не ўзяліся як сьлед за выкананьне дырэктыў ЦК аб яжасьці.

Падрыхтоўка да чысткі як у раёне, так і ў горадзе праведзена слаба. Фармальна на партыйных ячэйках, на агульных сходах рабочых абмяркоўвалі пастанову ЦК і ЦКК аб чысткі, аднак, пытаньне аб правядзеньні чысткі ня было ўвязана з выкананьнем гаспадарча-палітычных кампаній, з уздымам усёй партыйнай работы.

Да гэтага часу не на ўсе ячэйкі складзены характарыстыкі. Няма так сама характарыстыкі на большую частку сакратароў партыйных ячэек і калектываў.

Раённай праверачнай камісіі перш чым прыступіць да чысткі прышлося праводзіць падрыхтоўку. Вылучылі спэцыяльных людзей, якія праводзяць абсьледваньне ячэек і дапамагаюць у складаньні характарыстык.

У раёне створана шэсьць праверачных камісій. На чале камісій стаяць добрыя вытрыманы бальшавікі. Першай камісіяй кіруе старшыня райКК **Гетнэр**—член партыі з 1904 г., другой камісіяй кіруе **Няфедаў**—член партыі з 1917 г., дырэктар шаўковай фабрыкі **Хаскін** — член партыі з 1903 г., **Пузыроў і Левін**—начальнікі палітаддзелаў МТС і саўгасаў, **Сабалеўская**—член партыі з 1920 году.

Ужо чатыры дні як працуюць ячэйковыя камісіі. За гэтыя дні прайшлі праверку па горадзе 84 чал. і па вёсцы 15 чалавек. Актыўнасьць пры чысткі ня ўсюды аднолькавая. Пры чысткі парт'ячэйкі **Дашкаўскага сельсавету** на сходах прысутнічала звыш 200 калгасьнікаў і аднаасобнікаў, якія актыўна выступалі, давалі камуністам характарыстыкі.

Іншае ў ячэйцы **пэд'інстытуту**, дзе правяраўся член праверкому тав. **Гаманькоў**. З 400 студэнтаў на сходзе прысутнічала ўсяго 150. З вялікай труднасьцю раённай камісіі ўдалося выклікаць мінімальную актыўнасьць прысутных. Таксама па шаўковай фабрыцы, дзе зусім слаба выступаюць беспартыйныя рабочыя.

У ЗАЛІ НЕ ГЛЕДАЧЫ, А УДЗЕЛЬНІКІ ЧЫСТКІ

БелДРЭС. (Наш кар.).

Сход быў прызначан роўна на 8 гадзін увечары. У аб'явах значылася:

1) **Даклад камісіі па чысткі партыі і**

2) **справаздача сакратара партканлектыву — БАЯРЧАНКА.**

Гэта быў першы сход па чысткі на адным з асноўных прадпрыемстваў БССР, **на 1-й Белдрэс імя тав. Сталіна.** Камуністы, камсамольцы і беспартыйныя рабочыя і ітэраўцы станцыі па гэты сход сабраліся на рэдкасьць дружна і своячасова. У 8 гадзін заля Белдрэсаўскага клюбу была запоўнена ўся. У напружанай цішыні, звыш 400 рабочых, інжынэраў і тэхнікаў уважліва слухалі даклад старшыні ячэйковага праверкому тав. **Дзятлава** і справаздачу сакратара свайго парткалектыву тав. **Баярчанка.**

Абодвы даклады занялі ня больш паўтары гадзіны. Дакладчыкі ў сьціслых, скупых на словы і багатых зьместам дакладах азнаёмілі аўдыторыю з задачамі і асаблівасьцямі чысткі і з работай мясцовай партыйнай арганізацыі. І зараз-жа пасьля дакладу і справаздачы разгарнуліся спрэчкі, бурныя, актыўныя і дзелавыя.

Спрэчкі зацягнуліся далёка за поўнач. Выступалі лепшыя ўдарнікі — рабочыя, ітэраўцы, вылучэнцы — **Юстгаў, Бугаёў, Пашкевіч, Балашоў...**

І справаздача сакратара, і выступленьні ў спрэчках паказалі, што ў залі не гледачы, а актыўныя ўдзельнікі чысткі.

Сход даў разгорнуты малюнак работы партыйнага калектыву, яго дасягненьняў і недахопаў у барацьбе за бесьперабойнае забесьпячэньне спажыўцоў (фабрык, заводаў, рабочых пасёлкаў) электраэнэргіяй.

***

— У мінулым годзе мы выканалі свой прамфінплян толькі на 95 проц... Мы па працягу цэлых кварталаў зрывалі работы буйнейшых прадпрыемстваў Віцебску, Магілеву, Воршы, наносілі дзяржаве вялізарнейшыя страты.

У гэтым годзе выключэньняў асноўных спажыўцоў ня было. І гэта ёсьць лепшы паказальнік нашай работы.

Да рэчы, аб станоўчым як дакладчык, так і выступаючым ў спрэчках гаварылі мала. Усё больш падкрэсьлівалі памылкі, недахопы, шляхі і спосабы іх выпраўленьня. І можна зрабіць вывад: на аснове перабудовы сва ёй работы, перабудовы далёка не закончанай, партарганізацыя Белдрэсу мае не малыя дасягненьні ў барацьбе за каштоўнейшыя кілёват-гадзіны. Аднак, ёсьць і ня мала недахопаў.

Найбольш слабым месцам у рабоце парткалектыву зьяўляецца пастаноўка масава-выхаваўчай работы. Гэта — асноўны недахоп. А адсюль, як вынікі:

Зусім мала аддавалася ўвагі выхаваньню маладых камуністаў, мела месца пагоня за колькасным ростам арганізацыі. У **транспартнай** ячэйцы (сакратар **Кроік**) дайшло да таго, што «завербаваныя» ў партыю рабочыя ад маўляліся браць кандыдацкія карткі, бо яны былі атрыманы праз некалькі месяцаў пасьля «вярбоўкі», работа сярод «завербаваных» не вялася, людзі... забылі, што яны ў партыі, а тут ім даюць карткі і патрабуюць за мінулыя месяцы заплаціць 40—50 рублёў членскіх узносаў. У результаце за апошні час з 200 камуністаў у арганізацыі засталося толькі 123.

Партыйныя школы працавалі з перабоямі, наведваньне іх не перавышала 20—30 проц.

У рабоце ячэек і бюро калектыву выпалі пытаньні разгортваньня крытыкі і самакрытыкі. Глушыцелі яе ня прыцягваліся да суровай адказнасьці. Рабочыя **кацельнага цэху заўважаюць**, што яны баяцца выступаць супроць цэхавага майстра — камуніста **Апсіта**, бо ён ім будзе помсьціць. Інжынэр **Кансабрацкі** (таксама камуніст) выдаў клясавым ворагам аўтара заметкі, у якой сурова і абгрунтавана крытыкавалася работа майстраў кацельнага і турбінага цэхаў. На станцыі меў месца абураючы выпадак цкаваньня маладога спэцыяліста-члянавіка камсамолкі **Левінай** за тое, што яна выкрыла... буйныя перавыдаткі на прадпрыемстве.

Адсутнасьць масава-выхаваўчай работы на асобных вучастках вытворчасьці зьяўляецца адной з асноўных прычын таго, што як беспартыйныя рабочыя, так нават і камуністы праяўляюць вельмі мала клясавай пільнасьці. Ня гледзячы на тое, што ў кацельным цэху працуе найболып каму ністаў, там часта бываюць аварыі, прычыны якіх... «ніяк нельга выткумачыць».

У сувязі з гэтым неабходна адзначыць і тое, што партыйная арганізацыя станцыі зусім мала аддае ўвагі **апалаваму сэктару**, дзе працуе звыш 200 рабочых і амаль ні аднаго камуніста. Кіраўніцтва станцыі ня ведае твару гэтых рабочых, сярод якіх ня мала чужых і з яўна варожай дробна-уласьніцкай кулацкай псыхалёгіяй.

Належнай работы сярод іх не вядзецца і ў рэзультаце — з ваганэтак у палільні пападае 15—20 клг. кавалкаў жалеза, што і выклікае аварыі.

У апалавым сэктары падзвычай нізкая працоўная дысцыпліна і прадукцыйнасьць працы, а гэта часта ставіць станцыю ў падзвычай пагражаючае становішча. Бываюць выпадкі, калі няма чаго кідаць у палільні і кіраўніцтва прымушана «падымаць на ногі» ўсё і ўсіх, ратавацца ад пагрозы, парушаць плянавасьць і сыстэму ў рабоце ўсіх цэхаў. І ўсё гэта таму, што ўвага апалаваму сэктару аддаецца па прынцыпе — «на паляваньне ісьці — сабак карміць».

Пры наяўнасьці выстарчальнай колькасьці рабочых брыгады пільшчыкаў ніяк не маглі забясьпечыць станцыю патрэбнай колькасьцю дроў. Цыркулярка давала ня больш 20 куб. мэтраў у зьмену. Бюро парткалектыву кінула туды, «на прарыў», у жасьці брыгадзіра лепшага ўдарніка машыніста, члена партыі **Юстгава**. У першую сваю зьмену яго брыгада дала 42 куб. мэтры. А калі Юстгаву ў дапамогу далі яшчэ двух камуністаў, піла павысіла сваю прадукцыю да 10 куб. мэтраў у гадзіну.

Камуністы паказалі, як трэба працаваць. Але яны там толькі часова, «на прарыве», налётамі. І тав. Юстгаў мае рацыю, калі кажа, што такой дапамогі мала, трэба, каб апалавы сэктар меў штодзённае канкрэтнае кіраўніцтва.

***

Многа яшчэ аб чым гаварылі на сходзе.

Спрэчкі зацягнуліся далёка за поўнач, а сьпіс запісаўшыхся для ўдзелу ў спрэчках яшчэ і напалову ня быў вычарпан. А таму рашылі — спрэчкі перанесьці на ячэйковыя сходы, каб оказаць усё, каб дапамагчы сваёй партыйнай арганізацыі паэбавіцца ад недахопаў у рабоце.

Віт. ДАЛЬ.

ПАЛЕПШЫЦЬ АБСЛУГОЎВАНЬНЕ НАСЕЛЬНІЦТВА

Камісія па чысткі партыі пад старшынствам т. **Чыжовай**, скончыўшы 10 чэрвеня працу на **хэмфармзаводзе** 11 чэрвеня праводзіла чыстку партарганізацыі **аптэкакіраўніцтва.**

Даклад сакратара ячэйкі і спрэчкі, якія шырока разгарнуліся па дакладзе аб працы ячэйцы, паказалі, што ў рабоце ячэйкі КП(б)Б аптэкакіраўніцтва ёсьць значныя недахопы.

Прамфінплян за 1932 год быў выкананы на 150 проц., але-ж зданьне першага кварталу 1933 году выкана на на 87 проц. і да чысткі партарганізацыя аптэкакіраўніцтва прышла не ліквідаваўшы прарыву.

Асноўная прычына невыкананьня пляну—гэта адсутнасьць зваротных сродкаў. За амбуляторыямі і больніцамі на сёнешні дзень ёсьць значная запазычанасьць за медыкамэнты. У выніку гэтага зараз у Менску ляжыць на 70 тысяч руб. нявыкупленых тавараў.

Галоўная задача ячэйкі аптэкакіраўніцтва—гэта барацьба за наближэньне лекавай справы да насельніцтва, за штодзённае, бесьперабойнае абслугоўваньне працоўнага насельніцтва.

У рабоце аптэк па абслугоўваньні насельніцтва яшчэ на сёнешні дзень ня ўсё добра. Пакуль тая ці іншая аптэка прыгатуе лякарства хвораму, прыходзіцца чакаць 4-5 гадзін.

Даклад і спрэчкі паказалі, што ў некаторых аптэках мелі месца злоўжываньні. Так, у Глускай аптэцы была зроблена перавышэньне цэн, а таксама і разбазарваньне сьпірту.

Нельга ніяк абыйсьці той факт, што ў Белаптэкакіраўніцтве мае месца затаварваньне на суму каля 200 тыс. руб. як па гаспадарчай групе тавараў, так і па медыкамэнтах і мэд'інструмэнтах. Ячэйка КП(б)Б барацьбе з затавараньнем не надала патрэбнага значэньня.

Зараз аптэкакіраўніцтвам абвешчан месячнік штурму па ліквідацыі затаваранасьці. Гэты месячнік павінен даць рэальныя вынікі ў бок палепшэньня працы. Задача парт'ячэйкі заключаецца ў тым, каб узначаліць абвешчаны штурм.

Я-ч. В.

Пад знакам уздыму творчага энтузіязму

ВІЦЕБСК. Чыстка партыйных радоў па гарбарні канчаецца. Рабочыя заводу адзначаюць чыстку ўздымам творчага энтузіязму. Калі 8 чэрвеня, за дзень перад чысткай, прамфінплян быў выкананы на 78 проц., то 11 чэрвеня на 118 проц.

Брыгада камуніста **Нісэльсона** за апошнія 5 дзён выканала прамфінплян на 153 проц., **Кураўкіна**—158 проц., беспартыйнай работніцай **Раха вілай**—124 проц.

Перад тварам усіх рабочых прайшлі чыстку лепшыя ўдарнікі, энтузіясты, змагары за генэральную лінію партыі —**Лубімцаў, Шостак, Кудальскі** і г. д.

Пры актыўнай дапамозе беспартыйных рабочых праверкому ўдалося выявіць клясава-варожыя элемэнты, якія выпадкова пралезьлі ў партыю, хуліганаў, п'яніц, дызэртыраў вытвор часьці. Выкрыт **Назараў В.**—адзін з былых бандытаў, які ў 1924 годзе ўцёк з пад варты і хаваўся па розных гарадох Саюзу да 1929 году пад прозьвішчам **Мядзьведзеў** (клічка Назарчык). У 1929 годзе Назараў пралез на завод, а потым і ў партыю. Вёў антысавецкую агітацыю ў цэху, выкарыстоўваючы часовыя цяжкасьці, зьвязаныя з ростам сацыялістычнага будаўніцтва. Выкрыт **Васільеў**—п'яніца, не плаціў два гады членскіх узносаў, **Пасхольскі**—лодыр, дэзарганізатар вытворчасьці і рад іншых.

(БЕЛТА).

Прыяжджайце заўтра

(Ліст работніка палітаддзелу)

Ня гледзячы на канкрэтныя ўказаньні партыйных і савецкіх органаў аб парадку і бесьперабойным забесьпячэньні работнікаў палітаддзелаў саўгасаў і МТС, усё-ж у Клічаўскім раёне да гэтай справы адносяцца лёна бюракратычна.

Я ня менш 3-4 разоў прыяжджаў у раён за атрыманьнем прадуктаў для работнікаў палітаддзелу і заўсёды атрымліваў адказ: «прыяжджайце заўтра, а мы за гэты час вырашым». У апошнюю маю паездку я паказаў перадавую «Зьвязды» ад 18 мая, дзе справа ідзе аб агідных адносінах у некаторых раёнах да забесьпячэньня работнікаў палітаддзелаў.

Тав. Найдун, старшыня райсакжыўсаюзу, заявіў: «Гэта нішчацца не пра нас».

У сувязі з такімі адносінамі мы з 22-III па 20-V не маглі атрымаць з раёну ніякіх прадуктаў. І толькі 22-V. Найдун зьмілаваўся і выдаў палову прадуктаў за май месяц, а на маё запытаньне, ці выдадуць прадукты на красавік месяц, Найдун заявіў: «красавік пражылі, ну і добра, за мінулае мы не выдаем».

Апрача ўсяго гэтага, нам замест мукі выдалі збожжам, у той час, калі ў Клічаве ёсьць млын.

Просім рэдакцыю «Зьвязды» дапамагчы нам зьліквідаваць бюракратычную цяганіну і бездушныя адносіны паасобных работнікаў Клічаўскага раёну, якія перашкаджаюць выконваць задачы, пастаўленыя партыяй перад палітаддзеламі.

Г. Жыжынкаў.

АД РЭДАКЦЫІ: «Зьвязда» чакае тэрміновага адказу і прыняцьця мер ад Клічаўскага РК КП(б)Б на гэтаму лісту.

Манэўры клясавага ворага

(Ліст калгасьнікаў)

У 1931 г. у в. Хутар, Мачанскага с.-с., Бярэзінскага раёну, быў арганізаваны калгас. Пры арганізацыі яго не правяралі сацыяльнае становішча ўсту паўшых і ў выніку ў калгас пралезьлі варожыя элемэнты: **Веранейчык Яўген** — цьвёрдазаданьнік, **Пятровіч Юстын**, які ўвесь час эксплёатаваў бедн ату, заможнік **Верамейчык Віктар**, брат якога і зараз служыць у беларускай армі.

Гэтыя варожыя элемэнты павялі шалёную агітацыю супроць замацаваньня калгасу і да вясны 32 году разбурылі яго. У калгасе засталося толькі 4 гаспадаркі: **Лэнкавец Язэп, Бурдака Сымон, Верамейчык Саўка і Лыскавец Мікола.** Гэтыя 4 гаспадаркі ўліліся ў суседні калгас «Новы сьвет» і зямлю, якая прылічвалася на іх, прырэзалі па сумежнасьці да калгасу «Новы сьвет».

Зімою гэтага году да гэтых 4 гаспадарак далучыліся яшчэ 5 і зараз складаюць з 9 гаспадарак брыгаду к-су «Н. С.». Бачачы, што калгас умацоўваецца, што бяднацка-серадняцкія гаспадаркі ўступаюць у калгас, кулакі і падкулачнікі пашлі на хітрасьць і новымі манэўрамі арганізуюць работу па развалу калгасу.

Каб няпусьціць у калгас «Новы сьвет» астатнюю бяднацка-серадняцкую масу, кулакі і падкулачнікі арганізуюць з 9 гаспадарак новы «калгас» (у вёсцы Хутары ўсяго 18 гаспадарак і 9 з іх у калгасе «Новы сьвет»). Пры гэтым, каб не абагульваць рагатай жывёлы, кулаччо робіць фіктыўныя падзелы: з адной гаспадаркі робяць з (**Пятровіч Юстын, Буднік Іван** і іншыя).

Апрача гэтага кулаччо імкнецца парушыць межы калгасных палёў, адабраць частку зямлі, якой ужо 2 гады карыстаецца калгас «Новы сьвет».

Гэтага новага манэўру клясавага ворага ня толькі не разумеюць, а наадварот патураюць яму кіраўнікі Мачанскага с-с. і партыйнай ячэйкі. Замест таго, каб вычаць ворагаў з калгасу, старшыня с-с. **Карчык**, зьяднаўшыся з ворагамі, складае толькі акты аб «парушэньні» калгасных межаў. Дзеяньні Карчака на карысьць ворагам перашкаджаюць пасьпяховаму завяршэньню веснавой сяўбы ў калгасе «Новы сьвет».

Група калгасьнікаў.

Ачысьціць калгас „Зьвязда" ад кулакоў

(Ліст камсамольца)

Калгас «Зьвязда», Пераплаўскага с.-с., Вузьдзенскага раёну засмечан клясава-варожымі элемэнтамі. Рахункаводам працуе сын кулака **Паграбіцкі Хведар**, які да ўступленьня ў калгас меў 12 га зямлі, 2 коняй, 2 карозы, увесь час аж да 28 г. трымаў батрачку, сыстэматычна пазычаў хлеб, за які браў натурай удвая, або патрабаваў адработку. Да ўступленьня ў калгас Паграбіцкі меў цьвёрдае заданьне, потым, разбазарыўшы маёмасьць, ён пралез у калгас.

Праўленьне добра ведае паходжаньне Паграбіцкага і ўсё-ж даручыла яму такую справу, як рахункаводзтва і тры мае яго ў калгасе. У калгасе няма ўліку і непаладжан кантроль. Ужо 2 гады як ня было рэвізіі. У калгасе німат фактаў безгаспадарчасьці: напрыклад, брыгадзір **Гарэльскі** ўвесь час апрацоўваў зямлю свайго цесьця кулака Пармона. Не шкадуючы калгасных коняй, Гарэльскі давёў дзве кабылицы да скідышаў. Аб усім гэтым ведае старшыня калгасу Нікіфараў (член партыі), але мер ніякіх ня прымае, бо разам з Паграбіцкім і Гарэльскім п'янствуюць.

Факты безгаспадарчасьці ў калгасе асьвятляліся ня раз у центральным і раённым друку. Рад заметак аб гэтым калгасе было накіравана для расьследваньня і рэагаваньня ў Вузьдзенскі РКС і Райэа, але вынікаў і на сёнешні дзень няма.

Самакрытыка ў калгасе ў поўным загоне. За выступленьне супроць кулацкіх элемэнтаў, супроць безгаспадарчасьці ўжо два разы выключаліся з калгасу сем'і **Варанцова** П. і **Варанцова Я.** Трэба неадкладна ачысьціць калгас «Зьвязда» ад чужых элемэнтаў, прыцягнуўшы вінаватых да адказнасьці.

Камсамолец.

Разбазарваюць дзяржаўныя грошы

(Ліст служачага)

Ня гледзячы на яснасьць задач, на стаўленых партыяй на пляншэньні грамадзкага харчаваньня, усё-ж работа ў сталоўцы БАЭ (Бел. аддзяленьня Электрапраму — (Менск) пастаўлена зусім дрэнна.

Загадчык сталоўкі Раманаў самавольна павышае цэны па абедах. Напрыклад, 17 мая г. г. абед замест 80 кап. па калькуляцыі прадаваўся па рублю. І гэта ня першы раз. Прадукты для абедаў выдаюцца бяз пор мы, проста на вока, улік хлеба і іншых прадуктаў ня робіцца. Колькасьць патрэбных на гэты дзень абедаў не вызначаецца, у кантрольнай кнізе запісваецца агульны лік абедаў, без указаньня цаны, што дае магчымасьць рабіць злоўжываньні.

Калі заўкомам была вылучана камісія па абсьледваньні сталоўкі, то Раманаў разам з бухгалтарам Файву совічам стараліся замазаць факты безгаспадарчасьці, яны ўхіляліся ад праверкі, грубіянілі і г. д.

Адміністрацыя БАЭ работу сталоўкі не праверыла і ня цікавіцца ёю. У кіраўніцтве БАЭ ёсьць факты сямейнасьці і безгаспадарчасьці. Старшыня заўкому з ведама адміністрацыі прыстроіў на пасаду намесьніка загадчыка па збыту дэфіцытных электраматар'ялаў свайго швагра, не спэцыяліста, з акладам 400 руб. у месяц, з выдачай яму пад'ёмных 700 руб. Апрача гэтага, ёсьць яшчэ рад злачынных фактаў. Але досыць і гэтых, каб адпаведныя органы зацікавіліся данай арганізацыяй і зьнішчылі ўсе агідныя сьлядзі, што перашкаджаюць ёй у рабоце.

Ар. М.

Ад рэдакцыі: «Зьвязда» чакае ад Менгар КК-РСІ рэагаваньня на паданыя ў лісьце факты.

Справы камарынскія

Вельмольскія акупанты прымушаны былі пакінуць тэрыторыю Савецкай Беларусі. Нацыскала Чырвоная армія, якой дапамагалі партызанскія атрады з мясцовага насельніцтва.

Не здаваўся яшчэ бандыт Струкаў. Цёмнымі ночамі ён вылазіў з начных абшчараў і падпальваў вёскі, рабаваў насельніцтва. Кулакі ды папскія падпалімы спадзяваліся, што, можа, Струкаў арганізуе такую армію, якая зьнішчыць бальшавікоў. Яны дапамагалі Струкаву, пасылалі зброю, людзей, якіх ім удавалася апушчаць.

Нарошце, і ад Струкава з яго бандай засталіся толькі ўспаміны. Атаман нездома куды дзеўся, а частка банды была злоўлена і растрэляна. Тыя, што засталіся жыць, вярнуліся ў свае вёскі і сталі актыўнымі капіталістычнымі элемэнтамі.

Сумаваў упраўляючы памешчыка Рындзіна Сьцепзіеўскі. Цяжка было забыцца на мінулае. А гады ішлі, наступаў ужо дваццаць другі. Не хацелася Сьцепзіеўскаму і думаць пра тое, што трэба брацца за працу. Прыдумаць ня мо ж ён, як быць і што рабіць у далейшым.

На дапамогу прышоў упраўляючы княгіні Вэйкендорф—Каржанеўскі. Ён быў куды лепшы палітык, чым Сьцепзіеўскі. Яны выпрацавалі праграму дзеяньня. Перш за ўсё для выкананьня намечанай праграмы патрабавалася стварыць актыў. У актыўную работу былі ўцягнуты кулакі з в. Асаровіч: Падвербны Н. — сын жандара, Заяц Карней, Саладоўнік Іван, Саладоўнік Воін, Бельчанка Анапі і Сьцяпан, Заяц Цімох, струкаўскі бандыт Кандыбы Андрэй, а пасьля прыехаў і заняў пасаду загадчыка Асаравіцкай сямігодкі паручык белай армії Расюк.

Контр-рэвалюцыйная шайка, на чале якой стаяў Каржанеўскі, пачала сваю работу з вынучэньня тактыкі барацьбы рабочай клясы з капіталізмам. Яна добра вывучыла праграму камуністычнай партыі бальшавікоў для таго, каб лёгшанам партыі процідзіяць свае лёзунгі.

Шайка бандытаў добра ведала, што капіталістычныя клясы пазбавіць выйчаны. Шайка рашыла не здавацца. І вось у вясны дваццаць другога году Каржанеўскі паехаў у Рэчыцкі павятовы гэмаддзел прасіць, каб зацьвердзілі статут сельска-гаспадарчай арцелі, якую яны арганізавалі ў майстэрку памешчыка Рындзіна. Кіраўнікі Рэчыцкага УВК'у, падзакаваўшы Каржанеўскага за ініцыятыву, зацьвердзілі статут. Была зроблена заслона, за якой схаваліся кулакі, паны і бандыты.

У гэтай арцелі ня раз пасьля падышлі пацкімы, верныя заветам народнага кемісара зямляробства таго часу—Прышчэпана. Бяднацка-серадняцкім масам вакольных вёсак у арцелі толькі дазваляліся працаваць за мізэрную плату, а быць членам арцелі ні ў якім разе.

Вярнуліся дадому партызаны **Мельнік Кандрат і Царонак Андрэй.** Яны ўбачылі, што кулакі, паны і розные іншае атрэп'е сталі ўладарамі маёнтку, пачалі пісаць у раён, Наркамзем, прасілі прыехаць і разагнаць шайку бандытаў. А там, куды яны пісалі, сядзелі свае людзі, якія стараліся зрабіць зінзатымі тых, хто пісаў, абазвалі партызан контр-рэвалюцыянэрамі.

Так пачуваліся да 1927 году. І толькі ў дваццаць сёмым Андрэй Царонак быў выклікан сакратаром ужо Камарынскага райкому тав. **Шатунова**, які прапанаваў Царонку ўступіць у члены арцелі і выкрыць шайку бандытаў. Царонка доўга не хацелі кулакі і бандыты прыняць. У арцель быў накіраван яшчэ адзін член партыі тав. Плюшчэй.

Царонак і Плюшчэй рашуча ставяць пытаньне аб пашырэньні арцелі. Каржанеўскі, Сьцепзіеўскі і Расюк сабіраюць у сябе на кватэрах кулацкія сходы, выпрацоўваюць праграму дзеяньня бандытаў супроць калектывізацыі в. Асаравічы. Не дапамагло. Батракі, беднякі пачалі падаваць калектыўныя заявы аб прыёме ў арцель.

У хуткім часе быў скасаван кулацкі статут. Ад членаў арцелі патрабавалі абагуліць сродкі вытворчасьці. Бандыты адчувалі сваю бездапаможнасьць. Яны не маглі спыніць руху калектывізацыі. Тады яны рашылі пазбавіцца ад актывістаў Царонка і Плюшчэй. Ноччу быў зроблен напад на кватэру Царонка. Бандыты білі Царонка, пакуль ён ня страціў прытомнасьці. Яны былі ўпэўнены, што Царонак забіт. Аднак, прачнуўшыся, Андрэй пазіваў пару тыдняў у больніцы і зноў вярнуўся ў арцель.

Надыходзіў дваццаць восьмы год. Арцель становіцца калгасам **«Чырвоны барацьбіт».** Плюшчэй і Царонак становяцца на чале кіраўніцтва буйнейшай сацыялістычнай гаспадаркай. Пачынаецца вялікае будаўніцтва. І ўжо ў канцы дваццаць дзевятага году ў калгасе быў **пабудован парамы млын з крупарушкай і канцарэзкай. Пабудован хлеў на 250 шт. рагатай жывёлы, набыта 100 шт. жывёлы. Пабудавана цагельня магутнасьцю ў 500 тыс. цэглін за сэзон. Калгасьнікі пабудавалі бэтона-чарапічны завод.** Калгасьнікі рэмантавалі жыльлёвыя памяшканьні, будавалі новыя. Кулакі і паны—Сьледзіеўскі і Каржанеўскі былі высланы з тэрыторыі калгасу.

У 1930 годзе Плюшчэй і Царонка перакідаюць на іншую адказную работу. Лягчэй уздыхнулі бандыты, кулакі Расюк, Каццавы, Заяц Цімох, Заяц Карней і інш. Яны скарыстоўваюць слабасьць Асаравіцкай партыйнай ячэйкі, на чале якой стаяў Малевіч Ільля, і зноў пралазяць у калгас.

Контр-рэвалюцыйная шайка падбірае да рук старшыню Асаравіцкага сельсавету Малевіча Нікандра і адкрыта дзейнічае па разбурэньні калгасу. У хуткім часе іх дзейнасьць зрабіла ўшчэр на работу калгасу «Чырвоны барацьбіт». Кулакі прадаюць 20 тыс. пудоў сена. А вясной здохла 100 шт. рагатай жывёлы. Сакратар партыйнай ячэйкі Малевіч на падставе матар'ялаў, дасланых Царонкам Андрэем, быў выключан з партыі.

У хуткім часе ў калгас прыехаў на пасаду старшыні калгасу і сакратара Асаравіцкай партыйнай ячэйкі нехта Сокалаў. Яго спаткалі курыльшчыкі памешчык Якабсон Марцін і настаўнік, былы белагвардзеец Расюк. Сокалаў па свайму «слабому характару» ня мог адмовіцца, калі клясава-варожыя элемэнты запрашалі яго ў госьці.

Сокалаў разам з старшынёй сельсавету Малевічам Н. прымаюць у калгас ку лакоў, п'янствуюць разам з імі. У рэстаран уборачнай кампаніі 1932 году Сокалаў і Малевіч п'янствуюць у кулакоў в. Усоні, а ў беднякоў в. Вільня рэкві руюць сельска-гаспадарчыя прадукты. Для гэтага яны ўжываюць зброю. І калі ўдава Даўжанок Зіна ся мела чым пачаставаць Малевіча і Сокалава, яны не адмовіліся прыкласьці да яе твару свае рукі.

● Расюку неабходна ведаць аб пастановах партыйнай ячэйкі і апульных закрытых сходаў. Яму трэба мець свайго агента сярод членаў партыі. Ён пра сьціць Сокалава, як сакратара партыйнай ячэйкі давосіць яму ўсяць у якасьці хапкай работніцы кандыдата партыі былую батрачку **Галю Пінчук і той даў** яму згоду на гэта.

У хуткім часе Галя атрымлівае ад Расюка паліто, бацінкі і інш рэчы. Батрачка была вельмі здзіўлена «ні ласьцю» гаспадара і не заўважыла таго, як паступова рабілася агентам клясавага ворага.

Галя перадавала Расюку ўсё тое, аб чым гаварылася на сходах ячэйкі, яе пастановы. Старшыня калгасу «Чырвоны барацьбіт», ён жа сакратар Асаравіцкай партыйнай ячэйкі—Сокалаў становіцца лепшым прыяцелем белагвардзейца Расюка. Па яго настаяньні **Сокалаў** рэкамандуе ў партыю дачку кулака экспліёататара **Зайца Карнея**, які ў старыя часы меў свае воўчатоску, карыстаўся вялікім надзелам зямлі і гарадзіваў сенам. **Карней** у калгасе ліквідаваў лепшым ударнікам і атрымлівае ад «Сокалава прэміі.

Такім чынам, Расюк меў поўную магчымасьць безпакарана праводзіць сваю контр-рэвалюцыйную дзейнасьць, зрываць усе мерапрыемствы нашай партыі і ўраду. Шайка кулакоў і бандытаў струкаўцаў працавала на дрэнна (у сваіх мэтах) і гэта адбівалася на гас падарчым становішчы буйнейшай сацыялістычнай гаспадаркі. 14 коняй здохла ў часе веснавой пасеўнай кампаніі. 7 коняй па загаду **Сокалава** прадаецца на прыватным рынку за 240 рублёў.

Сокалаў разам са старшынёй сельсавету **Малевічам** п'янствуюць з кулакамі і былымі бандытамі, а работа стаіць. У выніку **80 га** сенажаці застаецца ня ўбраным.

Сокалаў купляе ў свайго прыяцеля **Малевіча** на дровы абалуцены хлеў і плошчэ яму **10 пудоў** жыта. Гэта ў той час як калгасьнікі бодзікі і батракі ня мелі хлеба. Малевіч прадае жыта на прыватным рынку і купляе сабе ў в. Любічы дом. У самы разгар уборкі Сокалаў перакідвае яшчэ фурманак на перавозку дому. Мала таго. Малевічу і кватэратару Акулёнку Сокалаў адпускае лес на будаўніцтва дому, які быў прыдбачан на пабудову калгасных лазьні

Ці ведалі аб дзеяньнях клясавага во рага і іх агентуры раённыя арганізацыі? Бясспрэчна, ведалі. Ведалі, але маўчалі. Чаму? Ды таму, што **Сокалаў** адпраўляў прадукты, мяса, масла, пшанічную муку на кватэры сакратара раённага камітэту партыі **Кавалёва** і старшыні РВК **Воўкава.**

У калгас «Чырвоны барацьбіт» выязджалі работнікі раёну для расьсьледваньня заяў, якія падаваліся калгасьнікамі пра дзеяньні **Сокалава, Малевіча і Расюка.** Цабывалі ў калгасе адказныя работнікі **Каплан, Гольдзін, Назаровіч** і інш. Яны таксама бачылі аднадзеі, але былі прымушаны маўчаць, таму што варочаліся да дому з грузам с. г. прадуктаў.

Прадукты калгасу разбазаваліся направа і налева. Акты рэвізыйнай камісіі, якія выкрывалі злачынствы **Сокалава, Малевіча, Расюка,** скасоўваліся

Царонак Андрэй у гэты час быў ужо на вучобе ў Менску. Ён прыехаў на канікулы ў калгас. І вось ён разам з пар тызанам **Губаравым** рашылі напісаць артыкул у рэдакцыю газэты «Зьвязда» аб агіднасьцях, якія твараліся ў калгасах **«Чырвоны барацьбіт»** і **«Інтэрнацыянал».**

У артыкуле Царонак і Губараў пісалі аб тым, што **адказныя работнікі Камарынскага раёну забясьпечваюць сябе прадуктамі калгасаў і таму ліквідарнічаюць у адносінах агентаў клясавага ворага Сокалава, Малевіча і старшыні калгасу «Інтэрнацыянал» Фядчуна.**

Па матар'ялах селькораў было праведзена абсьледваньне гэтых двух буйнейшых калгасаў брыгадай ЦКК КП(б)Б і рэдакцыяй «Зьвязды». У працэсе праверкі выявіліся яшчэ больш абураючыя факты, чым гэта было сказана ў допісах селькораў.

Што выявілася ў калгасе «Чырвоны барацьбіт»? На пасадзе кладаўшчыка быў былы абшчарнік Якабсон. Рэвізыйная камісія знайшла вялікі недахоп абожжа. Быў напісан акт, які Сокалаву не спадабаўся і ён загадаў дакладніцы лічыць.

Сокалаў чуў небясьпеку. Ён паехаў да сакратара райкому партыі **Кавалёва,** у якога вапытаў, як трымаць сябе, калі рэвізыйная камісія

Правал канфэрэнцыі краін-экспарцёраў пшаніцы

ЛЁНДАН, 17. (БЕЛТА). Канфэрэнцыя краін экспартэраў пшаніцы, у якой прымаюць удзел прадстаўнікі **Амэрыкі, Канады, Аргентыны і Аўстраліі, зайшла ў тупік.** У жэнэўскіх перагаворах месяц таму назад была дасягнута часткова згода аб дзесяціпроцантным скарачэньні пасеўнай плошчы. Далейшыя перагаворы былі адкладзены да эканамічнай канфэрэнцыі.

Зараз **Аргентына і Аўстралія** выказваюцца супроць скарачэньня пасеўнай плошчы, заяўляючы, што канадзкія і амэрыканскія «ліпшы» зьяўляюцца сапраўднай прычынай паданьня цэн. і патрабуюць зьнішчэньня гэтых «ліпшкаў».

Англа-француская пазыка на карысьць Аўстрыі

ЛЁНДАН, 17. (БЕЛТА). 10-га ліпеня ў **Лёндане** будзе выпушчана пазыка на карысьць Аўстрыі на суму 100 млн. аўстрыйскіх шылінгаў. Адначасова падобная-ж пазыка, на тую-ж суму, будзе выпушчана ва **Францыі.** Апрача таго ў **Швэйцарыі** будзе выпушчана пазыка на 8 млн. шылінгаў, у **Чэха-славакіі** — на 4 млн. шылінгаў, у **Галяндыі** — на 3 млн. і ў **Бэльгіі** — на 3 млн. шылінгаў.

Чэха-Славакія ўнесла частку чэрвеньскага ўзносу

ПРАГА, 16. (БЕЛТА). У выніку перагавораў чэхаславацкай дэлегацыі ў **Лёндане** з прадстаўнікамі ПАЗШ і перагавораў паміж урадамі Чэхаславакіі і Англіі, Чэхаславакія ўнесла 180 тысяч даляраў срэбрам у кошт узносу ад 15 чэрвеня па чэхаславацкаму доўгу Амэрыцы ў чаканьні канчатковага ўрэгуляваньня даўговай праблемы.

Узмацненьне польска-румынскай сувязі

ВАРШАВА, 17. (БЕЛТА). Гэтымі днямі ў Варшаву прыбыла дэлегацыя румынскіх журналістаў, якую ўзначальвае намесьнік дырэктара бюро друку, міністар замежных спраў **Другу.** Учора з удзелам румынскіх журналістаў у польскім міністэрстве замежных спраў адбылося пасяджэньне польска-румынскага саюзу друку. У варшаўскіх палітычных колах указваюць, што пасяджэньне польска-румынскага саюзу друку наданы асаблівы прыязны характар, каб зьмякчыць выяўленае ў розных колах уражаньне аб аслабленьні польска-румынскага саюзу.

Газэты паведамляюць адначасова, што 25 чэрвеня прыбудзе ў Варшаву прынц **Мікалай** (брат румынскага **короля**) для дэманстрацыі цеснай сувязі паміж Румыніяй і Польшчай.

СУПЯРЭЧНАСЬЦІ Ў ЛЯГЕРЫ ГЕРМАНСКАГА ФАШЫЗМУ

Гітлераўцы пагражаюць ліквідацыяй партыі цэнтру

БЭРЛІН, 17. (БЕЛТА). У бюлетэні нацыянал-сацыялістскай фракцыі прус **кага** ландтагу пад загалоўкам «партыйна-палітычная уніфікацыя» апублікован артыкул старшыні фракцыі **Кубэ.** У гэтым артыкуле Кубэ выступае супроць партыі нацыяналістаў, падкрэсьліваючы, што яе прыхільнікі ўсё яшчэ сядзяць па многіх кіруючых адміністрацыйных пасадах. Паводле слоў Кубэ, у сувязі з гэтым у радзе месц адбыліся падзеі, якія зьяўляюцца непрымімымі для нацыянал-сацыялістаў. «Партыя цэнтру, — піша Кубэ, — павінна зразумець, што яна ня зможа доўга праіснаваць як партыя. У гітлераўскай Германіі партыі цэнтру прыгатаваны той-жа лёс, які спаткаў у Італіі партыю **ПОП».**

***

БЭРЛІН, 17. (БЕЛТА). У **Бадэне** забаронена поўваенная арганізацыя партыі цэнтру «Бадэнвахт». Афіцыяльны матыў — «арганізацыя не праявіла лёяльных адносін да новай дзяржавы і яе органаў».

ПАЗШ узмацняюць ваенную авіяцыю

Ня гледзячы на тое, што ПАЗШ у Жэнэве выказаліся за адмаўленьне ад паветраных нападаў, іх ваенная авіяцыя перадала фірме «Глен Мартын» у **Бальтыморы** новы заказ на 38 бамбавозаў агульным коштам у 2 млн. даляраў.

Заказаныя бамбавозы зьяўляюцца самымі хуткаходнымі і самымі «сьмертаносьнымі» з усіх выпушчаных да гэтага часу гэтага роду машын.

(Уласн. інфармац.).

Скарачэньне дапамогі беспрацоўным у Чэха-Славакіі

Чэхаславацкі ўрад увесь час сыстэматычна скарачае дапамогу беспрацоўным. У той час, як на тры апошнія тыдні рада міністраў зацьвердзіла для дапамогі беспрацоўным 21 мільён крон, на тры бліжэйшыя тыдні зацьверджана ўсяго 13 млн. крон.

Беспрацоўным атрымліваюць па ты дзень харчовую картку коштам у 10 крон; главы сем'яў — на 20 крон.

Паводле даных афіцыяльнай статыстыкі, у красавіку месяцы было 798 тыс. беспрацоўных, для дапамогі якім патрэбна 8 млн. крон у тыдзень. Але з прычыны таго, што на тыдзень адпушчана ўсяго 4 млн. крон, **палова беспрацоўных застанецца без дапамогі.**

(Уласн. інфармац.).

Далейшае закрыцьцё капальняў у Польшчы

«Дзеньнік Віленскі» паведамляе аб далейшым закрыцьці капальняў **у Верхняй Сілезіі.** Гэтымі днямі Чэрнец кае вугольнае таварыства патрабавала спыненьня працы капальні «Гоым» у **Горным-Невядомю,** Рыбінскага павету.

На гэтай капальні працавала раней 1.650 рабочых, з якіх працуе за раз 1.000, рэшта знаходзіцца ў двух месячным прымусовым «адпачынку».

Гэта ёсьць чацьвертае патрабаваньне вугальнага таварыства аб закрыцьці капальняў Верхняй Сілезіі. Ранейшыя патрабаваньні датычаць буйных капальняў, як **«Эмма», «Блюхэр» «Донэрсмарк»** і ў Лазіскаг Горных капальні **«Брода».** Як зазначае газэта, закрыцьцё гэтых капальняў амаль ужо вырашана.

(Уласн. інфарм.).

Разгром яўрэйскай кнігарні ва Львове

Антысэміцкія выступленьні ў Польшчы ня спыняюцца. Зьбіваньне праходзячых па вуліцы яўрэяў, разгром яўрэйскіх крам і культурных устаноў—амаль штодзеннае зьявішча ў гарадох Польшчы.

Як падае «Дзеньнік Віленскі», гэтымі днямі ва **Львове** на вуліцы Капэрніка антысэміты разграмілі яўрэйскую кнігарню «Новасьці». Прычым, як заўсёды бывае, паліцыя не затрымала ні аднаго патромшчыка.

(Уласн. інфарм.).

Японская калёніза цыя Манчжурыі

Харбінская японская прэса ў апошні час аддае вялізарную ўвагу карэйскаму пытаньню ў сувязі з калёнізацыяй Манчжурыі.

Пацьвярджаецца, што Японія мае намер перасяліць 10.000 карэйскіх сем'яў у Манчжурыю і запяць іх землі ў Кароі для калёністаў з Японіі.

Карэйцы атрымаюць у Манчжурыі лепшыя землі, якія будуць адабраны ў кітайцаў.

Гэта мерапрыемства выклікала ўжо ўзброеныя сутычкі. Апошнія дні ўся прэса была поўна паведамленьняў аб выступленьнях кітайскіх сялян супроць новых прыбыўшых карэйцаў на поўдні Гірынскай правінцыі. Але ўсе гэтыя выступленьні былі задушаны японскімі войскамі.

У той-жа час газэты паведамляюць аб узмоцненым руху сярод саміх карэйцаў: яны патрабуюць зьнішчэньня вельмі цяжкіх падаткаў. Многія карэйцы пакідаюць свае вёскі.

Японія пагражала калёнізаваць Манчжурыю карэйцамі, бо японскія сяляне ня хочуць пакідаць Японію і паступаць у атрады калёністаў.

ЗАМЕЖНАЯ ХРОНІКА

● 13-га чэрвеня ў **Харбін** вярнуўся старшыня праўленьня КУЧ **Лі Шао-ген,** які выяжджаў у **Чаньчун** для нарады з урадавымі органамі **Манчжоу-Го.**

Японская прэса ўказвае, што Лі Шао-ген прапануе савецкай частцы праўленьня КУЧ пачаць перагаворы па ўсіх спрэчных пытаньнях у зьмешанай савецка-манчжурскай «канфлікт най камісіі».

* Японскае морское міністэрства ўказвае, што праграма новага морскага будаўніцтва патрабуе асьпгаваньня на працягу трох год 460 млн. іен, у тым ліку 100 млн. іен для стварэньня новых авіяэскадр і 360 млн. іен для іншых катэгорый ваенных суднаў. Па бюджэце 1934-35 г. г. будзе адпушчана 170 млн. іен.

Даць Данбасу рабочую сілу

Данбас дае апал нашай індустрыі і транспарту. Ад правільнай арганізацыі работы ў капальнях залежыць выкананьне пляну па здабычы вугалю.

За работай Данбасу сочыць уся наша краіна. Перад Данбасам партыя і ўрад паставілі задачу—даць 75 проц. усёй здабычы па Савецкім Саюзе.

У сваіх гістарычных пастановах ЦК УсеКП(б) і СНК СССР далі разгорнутую праграму па перабудове работы ўсесаюзнай качагаркі з тым, каб забясьпечыць выкананьне пляну па здабычы вугалю. ЦК і СНК указалі на прычыны адставаньня Данбасу і мабілізавалі ўвагу партыйных, гаспадарчых арганізацый і ўсіх рабочых на рашучае выпраўленьне недахопаў.

Данбас з раёну здабычы саматужным спосабам ператвораны у раён мэханізаванай здабычы. **80 проц. агульнага пляну будзе здабыта ўрубавымі машынамі, адбойнымі малаткамі і інш. мэханізмамі.**

ЦК і СНК з усёй бальшавіцкай ня прымірнасьцю ўдарылі па бездапаможнасьці і бясспрыкладнай адсталасьці гаспадарчага і партыйнага кіраўніцтва вугольнага Данбасу, якое прывяло да цякучасьці рабочых і служачых.

Зусім няправільна думаць аб тым, што пастановы ЦК і СНК «аб работе капальні, шахты, трэсту» адносяцца да выключна да работнікаў Данбасу. За рэалізацыю гэтых важнейшых пастаноў нясуць адказнасьць і партыйныя арганізацыі БССР.

На тэрыторыі БССР ёсьць значная колькасьць былых гарнякоў. Арганізацыі Данбасу прыслалі сваіх вярбоўшчыкаў для вярбоўкі старых гарнякоў у капальні. ЦК КП(б)Б даў указаньне раённым арганізацыям дапамагчы у вярбоўцы рабочай сілы. Аднак, гэта ўказаньне ў цэлым радзе раёнаў ігнаруецца. Гэта сьведчыць аб тым, што асобныя раённыя работнікі апынуліся ў палоне клясавага ворага, які імкнецца перашкодзіць забесьпячэньню Данбасу рабочай сілай.

У выніку ганебных адносін да гэтай справы квартальнае заданьне па вярбоўцы рабочай сілы выкапана толькі **на 39 процантаў.** Завербавана **790** чалавек замест **2 тысяч. Чэрыкаўскі раён павінен даць 200 чал. былых гарнякоў, а ня даў ніводнага. Клімавіцкі раён замест 200 чал. паслаў толькі 76 чалавек, Горацкі замест 250—паслаў 72 чалавека, Жлобінскі з 150 накіраваў 19 і Рагачоўскі са 100 чалавек—17.**

Старшыня **Рынкаўскага** сельсавету, **Чэрыкаўскага** раёну катэгарычна забараніў праводзіць вярбоўку на тэрыторыі сельсавету. Кіраўнікі **Зябінскага, Лабанаўскага і Шыраеўскага** сельсаветаў ня выдаюць даведак завярбованым гарнякам на права выезду ў Данбас.

Асобныя праўленьні калгасаў не адпускаюць рабочых у Данбас. Старшыня калгасу «Чырвоны Кастрычнік» **Маштароў,** старшыня калгасу «Экспарт»—**Якушэнка** завярбованым рабочым заявілі, што іх сем'і не атрымаюць хлеба з новага ўраджаю.

Раённы інспэктар міліцыі **Крамнікаў** у спрочках на сходзе калгасу «Экспарт» сказаў, што ўсе выдаткі на праезд рабочых у Данбас будуць вылічаны з зарплаты і што праўленьне калгасу будзе ўтрымліваць таксама з зарплаты 25 проц. на карысьць калгасу.

Сакратар раённага камітэту партыі (Чэрыкаў) **Кац** лічыць, што да скарачэньня сяўбы нельга займацца вярбоўкай рабочых з аднаасобнага сэктару з тэй прычыны, што аднаасобны сэктар значна адстае па выкананьні пляну сяўбы.

Партыйныя арганізацыі **Клімавічы, Чэрыкава і Быхава** не растлумачылі калгасьнікам і працоўным аднаасобнікам мерапрыемствы партыі і ўраду, накіраваныя на палепшэньне матар'яльнага і культурна-бытавога абслугоўваньня гарнящкіх мас.

Такія агідныя адносіны да справы вярбоўкі рабочай сілы вугольнай прамысловасьці нельга інакш расцэньваць як невыкананьне важнейшых дырэктыў партыі і ўраду. Раённыя арганізацыі павінны неадкладна пераключыцца на дапамогу вярбоўшчыкам з тым, каб забясьпечыць выкананьне заданьня па вярбоўцы рабочай сілы Данбасу. Заказ **усесаюзнай качагаркі на пастаўку рабочай сілы павінен быць неадкладна выканан.**

М—скі.

У ЦВК БССР

АБ ХОДЗЕ ЎСЕСАЮЗНАГА І ЎСЕБЕЛАРУСКАГА КОНКУРСУ НА ЛЕПШЫ ПА РАБОЦЕ СЕЛЬСАВЕТ

Прэзыдыум ЦВК БССР адзначыў, што рад раёнаў недаацанілі значэньня і ня ўключыліся ва ўсесаюзны і ўсебеларускі конкурсы на лепшы па рабоце сельсавет. Рад РВК і сельсаветаў уключыліся ў конкурс фармальна, ня прымаючы захадаў да практычнага ажыцьцяўленьня ўмоў конкурсу. У некаторых раёнах работа РВК па конкурсе пастаўлена настолькі нездавальняюча, што на чэрговую дошку занесены апорныя сельсаветы (Жыткавічы, Бабруйск, Віцебск, Дрыса, Лагойск, Магілеў, Чэрвень).

У сувязі з гэтым прэзыдыум ЦВК пастанаўляе: абавязаць усе **РВК** на працягу аднэй дэкады абгаварыць пытаньне аб уключэньні ва ўсесаюзны конкурс саветаў і раёнаў і аб мерапрыемствах для сапраўднага яго ажыцьцяўленьня. Пракурыць і паставіць на належную вышыню работу па конкурсе на ўсіх сельсаветах, МТС, саўгасах, калгасах і раённых установах і арганізацыях і падрыхтаваць усе матар'ялы, якія-б характарызавалі работу пасобных саветаў за час веснавой пасеўнай кампаніі. Разгарнуць работу вакол задач другога перыяду сельска-гаспадарчых кампаній у вёсцы —вакол прапоўкі і падрыхтоўкі да ўборкі ўраджаю.

Пашпартызацыя насельніцтва закончана

Пашпартызацыя насельніцтва Менску ў асноўным закончана. Выдана звыш 100 тыс. пашпартоў. Тыя, якія не пасьпелі яшчэ атрымаць пашпарт, атрымаюць у пашпартных сталох пры адпаведных гарадзкіх аддзяленьнях міліцыі.

З 13 чэрвеня пачалася праверка пашпартных дакумантаў, якая скончыцца да 20 чэрвеня. Рабочыя прамысловых прадпрыемстваў, дзе пункты ліквідаваны, прапісваюць свае пашпарты на агульна-гарадзкіх пашпартных пунктах па месцы свайго жыхарства.

Прыезд дзіцячай дэлегацыі Біра-Біджану

20 чэрвеня ў Менск з Біра-Біджану прыяжджае дзіцячая дэлегацыя ўдарнікаў вучобы.

Мэта прыезду — абмен вопытам барацьбы за выкананьне пастаноў ЦК УсеКП(б) аб піянэрарганізацыі і школе і ўмацаваньне інтэрнацыянальнай сувязі паміж школьнікамі Біра-Біджану і БССР.

(БЕЛТА).

МАКЕЕЎСКІ МЭТАЛЮРГІЧНЫ



НА ЗДЫМКУ: Домны макееўскага заводу.

ПА САВЕЦКАЙ БЕЛАРУСІ

Усесаюзная нарада па гісторыі Польшчы ў Менску

Па ініцыятыве Наркамасьветы і Інстытуту польскай пралетарскай культуры Беларускай Акадэміі Навук у Менску адбылася ўсесаюзная нарада па гісторыі Польшчы.

У работах нарады прымаў удзел рад выдатных польскіх вучоных Масквы, Ленінграду, Кіева. Сярод іх вядомы дасьледчык гісторыі Польшчы, супрацоўнік інстытуту гісторыі Камакадэміі СССР праф. ЯСІНСКІ, кіраўнік гістарычнага аддзелу польскага інстытуту пралетарскай культуры Усеукраінскай Акадэміі Навук тав. ДАБЖЫНСКІ а таксама работнікі менскіх ВНУ, інстытуту гісторыі БАН, інстытуту гісторыі партыі, камісіі Зах. Беларусі, яўрэйскага інстытуту пралетарскай культуры, літоўскага і латыскага сэктараў, настаўнікі польскага пэдтэхнікумскіх сярэдніх школ.

Нарада ўзьняла рад новых гістарычных пытаньняў. Некаторыя пытаньне аб фэадалізьме ў Польшчы, характары і рухаючых сілаў ня 1794, 1830-31 і 1863 г. г. вырашаны.

Прынята і распрацавана гісторыі Польшчы для ВНУ.

Матар'ялы нарады і праграма будуць выкарыстаны саньня ПЕРШАГА У САЮЗЕ НІКА ПА ГІСТОРЫІ ПОЛЬШ складаньнем якога працуюць гады польскіх навуковых Масквы, Менску і Кіева. Пад дзе выдан у гэтым годзе.

Дзесяцігодзьдзе МОПР'у БССР

11 ліпеня гэтага году ў Менску адбудзецца 4-ы зьезд мопраўскай арганізацыі БССР. Дзень адкрыцьця зьезду супадае з дзесяцігадовым юбілеем мопраўскай арганізацыі і днём вызваленьня Беларусі ад белапалякаў.

Па ўсіх раёнах і нізавых ячэйках разгортваецца работа па падрыхтоўцы да юбілейнага зьезду. Праходзяць спаборніцтвы на лепшае завяршэньне пасеўнай і пазыковай кампаніі. ЦК Мопру ўключыў у падрыхтоўчую работу да зьезду правадзімую зараз кампанію па перавыбарах бюро ячэек. Да 20-25 чэрвеня па ўсіх раёнах павінны быць скончаны перавыбарчыя канферэнцыі і абраны дэлегаты на зьезд.

Рыхтуецца да зьезду выстава, будзе адлюстроўваць рост і мопраўскай арганізацыі БССР. Па выставцы будзе выдадзена кніга, назвай: «Катарга і ссылка».

Рыхтуецца да друку «10 год Мопру». Адначасова будзе выпушчана спэцыяльная праграмата ў ліку 500 штук і новы значок.

У зьезьдзе будуць прымаць дэлегатаў, у тым ліку дэлегата канкому МОПР'у.

Правілы прыёму ва ўсебеларускі камуністычны тэхнікум у г. Магілеве

1. Абвяшчаецца асеньні набор 1933 году на асноўны курс тэхнікуму.

2. Тэрмін навучаньня ў тэхнікуме двухгадовы.

3. Тэхнікум рыхтуе працаўнікоў сярэдняга зьвяна раённых газэт (адказных сакратароў, загадчыкаў сэктароў і іх намесьнікаў) і рэдактароў шматгаражных газэт пры палітаддзелах саўгасаў і МТС.

4. У тэхнікум прымаюцца члены і кандыдаты КП(б)Б і камсамольцы ўзростам ад 17 да 30 год, маючыя вопыт партмасавай і грамадзкай работы і ўдзел у бальшавіцкім друку (рабкор, селькор, ваенкор, работнік газэты).

5. Паступаючыя ў тэхнікум павінны вытрымаць іспыты ў аб'ёме ня ніжэй пяці груп сямігодкі.

6. Прыём праводзіцца, як правіла, па камандыроўках партыйных і камсамольскіх камітэтаў.

7. Жадаючыя паступіць у тэхнікум павінны падаць у культпроп раённага партыі або камсамолу заяву і далучыць наступныя дакументы: 1) аб узросьце, 2) аб адносінах да службы ў Чырвонай арміі, 3) аб асьвеце, 4) аб стане здароўя, 5) аб сацыяльным і маемасным становішчы паступаючага і яго бацькоў, 6) характарыстыку мясцовай партыйнай або камсамольскай арганізацыі, а таксама пажадана характарыстыка мясцовай газэты, 7) анкеты, засьведчаныя савецкімі ўстановамі (або прафсаюзнымі арганізацыямі раённага маштабу).

8. Тэрмін прысылкі дакументаў у тэхнікум не пазьней 20 жніўня гэтага году. Дакументы дасылаць у Магілеў н-Д. Камсамольская 4.

9. Камандыруемыя ў тэхнікум бясьспечваюцца мясцовымі арганамі сродкамі на праезд у два бокі, харчаваньнем і кватэрай на час навучаньня, а таксама пенсіі за два тыдні ўзалічаньня захоўваюць пасадзі, якія раней займалі.

10. Студэнты, залічаныя ў тэхнікум, забясьпечваюцца харчаваньнем і стыпэндыяй у разьмерах ад 140 рублёў у месяц у залежнасьці ад пасьпяховасьці навучаньня і іншых становішча, а таксама інтэрнатам, ручнікамі і пісьмовымі прыладамі, павінны мець свае пасьцельныя прылады.

11. Пры тэхнікуме прыёмная камісія працуе з 15 па 25 жніўня і з 30 жніўня адбываюцца іспыты.

12. Прыём у тэхнікум устанавіць на 1933 год у 80 чал. Райвыканкомы жывёлагадоўчых раёнаў дырэктуюць па 2 чал., астатнія — ...

Заняткі ў тэхнікуме пачнуцца 1 верасьня 1933 году.

Загадчык Культпропу ЦК КП(б)Б на 20 чэрвеня а 10 гадзіне у залі пленуму ЦК, скліканай ўсебеларускую нараду ВТР

Нам. Наркамасьветы і Дырэктар тэхнікуму ПВ

Папраўка

У артыкуле тав. Маеўскага аб фасфарытных багацьцях БССР («Зьвязда» за 16 чэрвеня, № 131) у апошнім абзацы замест 43,85 тон, трэба 43,85 тыс. тон, замест 34,80 чытаць 34,8 тыс. тон.

Паведамленьні

22 чэрвеня ў 6 гадзін ўвечары ў памяшканьні дому Камасьветы (Карла Маркса і Энгельса) адкрываецца ДРУГАЯ ЎСЕБЕЛАРУСКАЯ ФЭРЭНЦЫЯ ПАДПОЛЬШЧЫКАЎ — ЧЛЕНАЎ КП(б)Б З ДАКАСТРЫЧНІЦКІМ СТАЖАМ.

Парадак дня канфэрэнцыі наступны: 1) справаздачны даклад дыуму Беладдзяленьня ўсесаюзнага таварыства старых бальшавікоў бары прэзыдыуму і рэўкамісіі Беладдзяленьня ВОСБ; 3) выбары на ўсесаюзную канфэрэнцыю таварыства старых бальшавікоў.

Удзел у рабоце канфэрэнцыі ўсіх членаў КП(б)Б са стажам стрычніцкай рэвалюцыі абавязковы.

Запрашаюцца таксама члены КП(б)Б—падпольшчыкі пэрыяду кай і белапольскай акупацыі.

Сродкамі на праезд, харчаваньнем і кватэрай дэлегаты будуць печаны за кошт Беладдзяленьня таварыства старых бальшавікоў.

БЕЛАДДЗЯЛЕНЬНЕ ВО

Культпроп ГК КП(б)Б паведамляе, што Менскаму раёну прадастаўлена 20 шесц для пасылкі на вучобу ў Камуністычны Інстытут Журналістыкі БССР.

Таварышы, якія жадаюць паступіць у КІЖ, павінны падаць заяву ў партколектыў і ячэйкі для атрыманьня рэкамэндацыі.

Аб умовах прыёму даведацца ў Культпроце ГК, пакой № 49.

Тэрмін падачы заяў да 15-VII г. г.

КУЛЬТПРОП ГК КП(б)Б.

19-га чэрвеня, а 7-й гадз. увечары, у памяшканьні Дому Камасьветы (клюб Карла Маркса) адбудзецца нарада жанарганізатараў усіх парткалектываў і ячэек.

З прычыны важнасьці пытаньняў яўка ўсіх жанорганізатараў абавязкова.

АГІТМАС ГК КП(б)Б.

19-га чэрвеня г. г., а 7-й гадз. увечары, у Доме Камасьветы (клюб Карла Маркса) адбудзецца лекцыя для партыйнага актыву т. **Агульніка** на тэму: «Барацьба партыі па два фронты».

МЕНГАРКОМ КП(б)Б.

Адказны рэдактар Г. Н. БРАГІНСКІ.

АНОНС! Дзіцячы гукавы кіно-тэатр Савецкая 1. 90.

АНОНС! Гэтымі днямі найлепшы гукавы мастацкі фільм

ПЕРАМОЖЦЫ НОЧЫ

КІНО-ТЭАТР „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА“ Сёньня, 19 чэрвеня і штодзенна НОВЫ МАСТАЦКІ ЗАМЕЖНЫ ФІЛЬМ

Драма ў 7 частках)—(ЗВЫШ ПРАГРАМЫ—кіно-хроніка Свюзкіно

Пачатак у 6. 7-30, 9 і 10-30. Каса—ад 1 г. дня. Дзеці да 16 год зусім не дапускаюцца.

„ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ“ Мастацкі фільм „АЭЛІТА“ (АНТАЙ... АДЭЛІ... УТАЙ...)

„ПРАЛЕТАРЫ“ Мастацкі замежны фільм „Чалавек, які сьмяецца“ драма ў 10 частках.

ДЗІЦЯЧЫ кіно-тэатр Каса—з 1 г. дня. Мастацкі фільм САЛДАЦКІ СЫН у 6 частках.

Беларускі Дзяржаўны зоатэхнічны інстытут сьвінагадоўлі

абвяшчае

АСЕНЬНІ НАБОР

студэнтаў на 1-ы курс дзённага і вячэрняга аддзяленьня.

У Інстытут прымаюцца асобы, скончыўшыя сярэднія навучальныя ўстановы пасьля іспытаў.

Заявы прымаюцца да 15-8-33 г.; з 15-8 па 1-9-33 г. іспыты, а з 1-9-33 г. пачатак заняткаў. Студэнты Інстытуту забясьпечваюцца Інтэрнатам, сталоўкай і стыпэндыяй, згодна іх акадэмічнай пасьпяховасьці, сацыяльнага становішча і стажу парт. і грамадзкай працы ў разьмерах ад 55 р. да 95 р. у м-ц як мінімум.

Тэрмін навучаньня ў Інстытуце 4 гады. Інстытут надае кваліфікацыю зоатэхніка—сьвінавода з вышэйшай адукацыяй.

Умовы прыёму агульныя, згодна палажэньня Наркамасьветы БССР.

Заявы з дакумантамі накіроўваць па адрасу: г. Магілеў, БССР, Камсамольская вул № 14, Інстытут Сьвінагадоўлі, прыймовай камісіі.

ДЫРЭКЦЫЯ.

НЕ ЧАКАЙЦЕ АПОШНІХ ДЗЁН ЗДАЧЫ ПАДПІСКІ на газэту „ЗЬВЯЗДА“ НА ДРУГОЕ ПАЎГОДЗЬДЗЕ, А ЗДАВАЙЦЕ ЗАРАЗ.

Сваячасовая здача падпіскі дазваляецца лепшай гарантыяй аккуратнай дастаўкі.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА: Ленінская, 34, 2-гі паверх (пошта), тыражніцкімі, гарбюро Сьвіздруку, лістаносцамі, якія маюць на гэта пасьведчаньні, а таксама кіёскерамі па продажу газэт.

МЕНСКІ АРХІТЭКТУРНА-БУДАЎНІЧЫ ТЭХНІКУМ (былы Паліттэхнікум)

АБВЯШЧАЕ

НАБОР СТУДЭНТАЎ

на дзённае і вячэрняе аддзяленьні

На дзённае аддзяленьне:

а) па прамысловаму будаўніцтву;
б) „ жыльлёваму будаўніцтву;
в) „ ацяпленьні і вэнтыляцыі.

Вячэрняе аддзяленьне:—жыльлёвае будаўніцтва.

Паступаючыя павінны прадставіць наступныя дакументы:

а) заверанную анкету, б) даведку аб сацыяльным становішчы бацькоў, в) пасьведчаньне аб скончэньні сямігодкі, г) даведку аб нараджэньні, д) даведку аб стане здароўя е) характарыстыку аб партыйных і грамадзкіх арганізацыях аб удзеле ў грамадзкай працы.

Прыём заяў праводзіцца ў канцылярыі Менскага Архітэктурна-Будаўнічага Тэхнікуму (вуліца Карла Маркса 5) ад 15 чэрвеня г. г. па 1-е жніўня 1933 г.

Аб прыёмных іспытах будзе абвешчана дадаткова праз друк і асабіста па адрасу паступаючага.

УВАГА: на вячэрняе аддзяленьне прымаюцца з адукацыяй на базе шасьцігодкі.

Дырэкцыя тэхнікуму.

МЕНСКАЯ школа ФЗВ камунальных прадпрыемстваў абвяшчае набор вучняў

у сталярны і каменна-печны цэхі з ведамі 3-цігодкі і 7-нігодкі

Прыём заяў з 18-га чэрвеня па 15 жніўня 1933 г. Прынятыя забясьпечваюцца інтэрнатам і стыпэндыяй ад 30 да 60 руб.

Дакументы дасылаюцца згодна даведніка аб прыёме ў навучальныя ўстановы, па адрасу: Менск, Нова-Маскоўская 76-І, Менская школа ФЗВ Камунальных прадпрыемстваў.

ДЫРЭКЦЫЯ.

Кіно „СПАРТАК“ Ад 19 чэрвеня замежны мастацкі фільм.

ЛУЛУ

драма ў 6 частках.

У галоўн. ролі: АСТА НІЛЬСЕН. АЛЬБЭРТ БАСЭРМАН.

Каса—з 3 гадз. 30 м. дня.

ОБЩЕСТВО ПРОЛЕТАРСКОГО ОПТЭ ТУРИЗМА И ЭКСКУРСИЙ

Бюро падарожжаў ЦС паведамляе, што ўсе бавы Бюро УНОЎ АДРАМАНТАВАНЫ і забясьпечаны харчаваньнем.

Запіс на маршруты ў мясцовых саветах ОПТЭ.

У сэктар абвестак газэты „ЗЬВЯЗДА“ званеце па тэлефону № 21-358

РАБФАК хэміка-тэхналёгічнага інстытуту АБВЯШЧАЕ ПРЫЁМ СТУДЭНТАЎ на 1 і 2-гі КУРС РАБФАКУ з адрывам і без адрыву ад вытворчасьці.

На 1 курс прымаюцца рабочыя, калгасьнікі і сяляне-беднякі, якія маюць працоўны стаж ня менш 3 год і адукацыю або веды ў аб'ёме 4 груп сямігодкі.

На 2-гі курс патрэбна мець веды ў аб'ёме 6 груп сямігодкі.

Пры заяве патрэбна прыкласьці дакументы згодна даведніку НКА БССР.

Заявы з дакумантамі прымаюцца ў канцылярыі рабфаку (Менск, Земляробскі заў., д. № 4) кожны дзень ад 9—4 гадзін **да 15-га жніўня.**

Іспыты на 1 курс па матэматыцы, грамадазнаўстве і беларускай мове і на 2-гі курс па праграме 1 курсу пачнуцца з 25-га жніўня.

Пачатак заняткаў з 1-га верасьня.

Дэканат рабфаку.

ВІЦЕБСКІ РАБФАК пры Індустр.-пэдаг. інстытуце абвяшчае АСЕНЬНІ НАБОР

студэнтаў на дзённыя і вячэрнія групы ўсіх курсаў і 3 курс яўрэйскага аддзяленьня ў горадзе і ў пралетарска-слабодзкім філіяле.

Вячэрнія групы працуюць без адрыву ад вытворчасьці і стыпэндыяй не забясьпечваюцца.

Дзённыя групы першага курсу забясьпечваюцца стыпэндыяй на 75 проц., 4курс веч. Рабфаку на 50 проц., астатнія курсы на 100 проц. Стыпэндыяты забясьпечваюцца інтэрнатам.

Прыём па іспытах, якія адбудуцца 1 верасьня, пачатак заняткаў 7-9. Прыём заяў да 25 жніўня на адрасе: Віцебск, Валадарскага № 58-15, Пэдрабфак. Прыём згодна правіл НКП.

Дырэкцыя.

МЕНСКІ ДАШКОЛЬНЫ ТЭХНІКУМ абвяшчае НАБОР на 1-шы курс 160 чал. беларускае і яўрэйскае аддзяленьні.

Таксама праводзіцца набор і ў вячэрні тэхнікум без адрыву ад вытворчасьці на 60 чал.

Прымаюцца асобы з ведамі за 7 груп.

Заявы з дакумантамі прымаюцца да 15-га жніўня.

Студэнты будуць забясьпечаны стыпэндыяй і інтэрнатам.

Адрас: Менск, Савецкая, 144, Менскіда школьны тэхнікум.

Дырэкцыя.